Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 117 (4950)
МАЙ
31
ЧАЦВЕР
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцесь!

СЁННЯ У НУМАРЫ:

СОВЕЦКІ САЮЗ У БАРАЦЬБЕ ЗА МІР—ПРАМОВА ТАВ. ЛІТВІНАВА НА СЕСІІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ КАМІСІІ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА РАЗЗБРАЕННЮ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ —ШЫРОКА УКАРАНІЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗДЗЕЛЬШЧЫНУ У КАЛГАС І БРЫГАДУ.

Н. ЛЕЎКОВА— ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ АСВЯТЛЕННЯ ПЫТАННЯЎ ГІСТОРЫІ КП(б)Б.

УЗНАГАРОДЖАННЕ КАМАНДЗІРАЎ І ПАЛІТРАБОТНІКАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

НОВЫЯ ПАРУШЭННІ СОВЕЦКАЙ ГРАНІЦЫ ПАРАХОДАМ МАНЧЖОЎ-ГО.

ЗАБАРОНА КОМПАРТЫІ У ДАНЦЫГУ.

У МЕНСКУ АДКРЫЎСЯ МАСКОЎСКІ МЕДЫЦЫНСКІ «ТЫДЗЕНЬ».

ШЫРОКА УКАРАНІЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗДЗЕЛЬШЧЫНУ У КАЛГАС І БРЫГАДУ

Агульнавядома, што праца ў нашых калгасах яшчэ малапрадукцыйная. І калі ўскрыць прычыны гэтага, то мы ў першую чаргу сустрэнемся з фактам страшэннай ураўнілаўкі ў калгасах. У той час як у крамысловасці пасля гістарычнай прамовы таварыша Сталіна аб шасці ўмовах была шырока ўкаронена індывідуальная і прагрэсіўна-прэміяльная здзельшчына, у нашых калгасах, як правіла, работа праходзіць «скопам». Калі аруць, то аруць па 10-15 плугоў разам. Калі полюць, то полюць разам 10-15 жанчын. Калі косяць, то ідзе ў рад 5-10 касцоў.

А хіба нам незразумела, што пры цяперашнім становішчы нашых калгасаў, пры цяперашнім узроўні развіцця нашых калгаснікаў гэта работа «скопам» прыводзіць к рэзкаму зніжэнню прадукцыйнасці працы, к зніжэнню зацікаўленасці ва ўдарных тэмпах нават у тых, якія працуюць добрасумленна. Характэрна, што за работу «скопам» гарой стаяць лодыры і кулацкае ахвосце. Кулацкае ахвосце за работу «скопам», бо яно ведае, што ўкараненне індывідуальнай здзельшчыны рэзка павысіць прадукцыйнасць працы ў калгасе, павысіць зацікаўленасць калгаснікаў у працы і, стала быць, узмацуе калгасы. Гультаі за работу «скопам», супроць індывідуальнай здзельшчыны, бо яны разумеюць, што пры індывідуальнай здзельшчыне ім ужо не ўдасца лынды біць, што яны ўжо не змогуць выязджаць за кошт другіх. Чаго варты прыклад калгаса «Маяк социялізма» (Барысаўскі раён), дзе з увядзеннем індывідуальнай здзельшчыны адразу-ж былі выгнаны гультаі і бракаробы.

І характэрна, што ўсюды, дзе ўводзілася індывідуальная здзельшчына, вакол гэтага пытання разгортвалася жорсткая барацьба. «У яго лепшы конь, а ў мяне—горшы», «а мо' яму пападзецца лягчэйшая глеба, а мне цяжэйшая», «а ўсходы засмечаны-ж па-рознаму»—якія толькі довады не выдумляюць свядомыя і несвядомыя ворагі калгаса, каб сарваць увядзенне індывідуальнай здзельшчыны. А якія яна результаты дае, паказваюць крукчэмскія карэспандэнцыі з Барысава і Сяньно. У калгасе «Маяк социялізма» індывідуальная здзельшчына з'явилася ў веснавой сяўбе 1,5 працэнта на агнін гектар. У калгасе «Дубаўцы» (Сенненскі раён), дзе да ўкараўнення індывідуальнай здзельшчыны калгаснікі ўзышалі 0,30 гектара, пасля яе ўкаранення норма павысілася.

Такое-ж падзенне мы маем у другім калгасе «Буй». А гэтыя калгасы не выключэнне. Можна прывесці сотні прыкладаў рэзкага павышэння прадукцыйнасці працы пры ўкараненні індывідуальнай здзельшчыны. І гэта зразумела. Кожны чэсны калгаснік і калгасніца, атрымліваючы індывідуальнае заданне на ворыву, баранаванню, праполцы, знаў, што яго праца будзе ўлічана асобна, што яму не прыдзецца працаваць на адстаючага. І характэрна, што там, дзе ўкарапілі індывідуальную здзельшчыну, там рэзка палепшаецца ранні выхад на работу, там уччыльняецца ўвесь рабочы дзень. Індывідуальная здзельшчына з'яўляецца той асновай, на якой разгортвалася і разгортваецца социялістычнае спаборніцтва ў брыгадзе.

Індывідуальная здзельшчына з'яўляецца самым прасцейшым сродкам уцягнення шырокіх слаёў калгаснікаў і калгасніц у рады ўдарнікаў. Палітычнае і эканамічнае значэнне справы ўкараўнення індывідуальнай здзельшчыны велізарнае. А мы ўвайшлі якраз у такі перыяд пільных работ—праполка, сенакос,—дзе індывідуальная здзельшчына мае асаблівае значэнне.

Баявая задача партыйных арганізацый, палітаддзелаў, МТС і райзямаддзелаў—укараніць індывідуальную здзельшчыну на ўсіх тых сельска-гаспадарчых работах, дзе гэта магчодна.

Для нас, большэвікоў, ні індывідуальная, ні дробнагрупавая, ні брыгадная здзельшчына не з'яўляюцца самамэтай. Які від здзельшчыны плынен быць прымянён на той або іншай рабоце—гэта пытанне практыкі, а не прынцыпу. На зграбанні, напрыклад, сена, мэтазгодна дробнагрупавая здзельшчына, на касьбе—індывідуальная. Калі некалькі ўдарнікаў хочуць касіць групай, зразумела, брыгадзір не можа гэтага забараніць.

Пры ўвядзенні індывідуальнай здзельшчыны звычайна блытаюцца з пытаннем аб захаванні звяна. Не цяжка зразумець, што індывідуальная здзельшчына не супярэчыць факту існавання звяна. Возьмем, напрыклад, праполку. Звяно атрымлівае ўчастак праполкі. Кожны дзень звеннявы адводзіць праполшчыцы пэўную палоску для праполкі, дапамагае брыгадзіру ўлічаць працу кожнай праполшчыцы.

БССР паспяхова закончыла веснавую сяўбу. Баявая задача дня —замацаваць і папярыць поспехі вясны. Шырокім укараненнем індывідуальнай здзельшчыны мы створым рашаючыя ўмовы далейшага росту прадукцыйнасці калгаснай працы, рашаючую ўмову для баявога правядзення сенаўборкі і ўборкі ільну і зернавых.

УЗНАГАРОДЖАННЕ КАМАНДЗІРАЎ І ПАЛІТРАБОТНІКАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

МАСКВА, 29 мая. (БЕЛТА).

У спецыяльным загадзе аб скапчэнні вучэбнага 1933 г. т. ВАРАШЫЛАЎ абвяшае пастанову прэзідыума ЦВК СССР аб узнагароджанні камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай арміі.

Адзначаючы ў гэтай пастанове высокія баявыя і палітычныя падрыхтоўкі, дасягнутыя Рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй, і самаадданую работу байцоў-камандзіраў і палітработнікаў па ўмацаванню магутнасці РСЧА, ЦВК СССР УЗНАГАРОДЗІЎ 73 КАМАНДЗІРАЎ І ПАЛІТРАБОТНІКАЎ ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАЙ ЗВЯЗДЫ, 66 ТАВАРЫШОЎ УЗНАГАРОДЖАНЫ ГАНАРОВЫМІ ГРАМАТАМІ ЦВК СССР. Адначасова Рэвваенсавет СССР узнагароджаў гэтых 66 таварышоў, атрымаўшых грамоты ЦВК СССР, каштоўнымі падарункамі.

Аграча таго, Рэвваенсавет СССР абвясціў 25 таварышам падзяку за ўмелае кіраўніцтва баявой і палітычнай падрыхтоўкай часцей, а таксама ўзнагарадзіў іх каштоўнымі падарункамі.

Віталючы ўсіх узнагароджаных камандзіраў і палітработнікаў, а таксама ўвесь чырвонаармейскі і начальніцкі склад Чырвонай арміі, т. Варашылаў выказвае ўпэўненасць, што гэта першае за гады мірнага будаўніцтва Чырвонай арміі ўзнагароджанне ўрадам камандніка складу РСЧА за яго работу па ўмацаванню баявой магутнасці РСЧА з'явіцца магутным стымулам для далейшай упартай большэвіцкай работы ўсяго асабістага складу РСЧА па ўдасканаленню і росту баявой, палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўкі Чырвонай арміі.

Тав. Ф. Я. КОНУ

ЦК КП(б)Б шле Вам, тав. ФЕЛІКС, палкаму барацьбіту за пролетарскі інтэрнацыяналізм, любімаму трыбуну рабочага класа і працоўных мас, актыўнаму ўдзельніку грамадзянскай вайны ў барацьбе за вызваленне Совецкай Беларусі — гарачае прывітанне ў дзень Вашага семідзесяцігоддзя.

ЦК КП(б)Б жадае Вам яшчэ многіх год здароўя і неаслабнай энергіі для барацьбы за канчатковую перамогу социялізма.

ЦК КП(б)Б.

10 ЧЭРВЕНЯ—УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ ЛЕПШЫХ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ

Рэдакцыя «Звязды» і цэнтральная камісія па спаборніцтву сельсоветаў пры ЦВК склікае 10 чэрвеня

ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ

перадавых старшынь сельсоветаў.

Кожны раён мае права паслаць аднаго дэлегата—лепшага старшыню сельсавета ў раёне. РВК абавязаны тэлеграфна паведаміць (у рэдакцыю «Звязды») прозвішчы дэлегатаў не пазней 7 чэрвеня.

Совецкі Саюз у барацьбе за мір

Прамова т. ЛІТВІНАВА на сесіі генеральнай камісіі канферэнцыі па раззбраенню

ЖЭНЕВА, 29 мая. (БЕЛТА). Сёння адкрылася сесія генеральнай камісіі канферэнцыі па раззбраенню.

Пасля выступленняў Гендэрсона і Дэвіса на трыбуну падымаецца т. М. М. ЛІТВІНАЎ. К пачатку яго прамовы — зала поўная. Усе дэлегацыі на месцы. Сесія выслухвае т. Літвінава з найвялікшай напружанай цікавасцю. Тав. Літвінаў гаворыць:

— Перад данай сесіяй генеральнай камісіі стаяць два пытанні. Першае — яна павінна канстатаваць магчымасць ці немагчымасць выканання прамой задачы канферэнцыі, а менна: вырашэння праблемы раззбраення і ў апошнім выпадку ўстанавіць прычыны няўдачы. Дазволіцельна сумнявацца, каб усе прысутныя тут дэлегацыі маглі зыйсці на адзіным заключэнні аб прычынах няўдачы, але, на маю думку, было-б неабходна і вельмі карысна, каб хоць адзельныя дэлегацыі ў пасобку выказалі свае меркаванні пакуль гэтага.

Наступнае пытанне, якое, мабыць, галоўным чынам будзе заклапочваць камісію, гэта аб далейшым лёсе самой канферэнцыі па раззбраенню. Неабходна будзе вырашыць, ці павінна яна прадаўжаць сваё існаванне і чым яго ў такім выпадку наўоўніць, ці яна павінна добраахвотна перайсці ў становішча небыцця.

Не чакаючы далейшай дыскусіі, я дазволю сабе ўжо цяпер выказаць у сваіх меркаваннях з факта немагчымасці знаходжання вырашэння праблемы раззбраення з прычыны непрымірымасці выяўўшыхся рэчаіснасцяў. Для кароткасці я адзначу толькі асноўныя рэчаіснасці.

Ужо з самага пачатку работ не толькі самой канферэнцыі, але і падрыхтоўчай камісіі выявіліся дзве карэнныя плыні: адна — прадстаўленая совецкай дэлегацыяй, а другая — амаль усімі астатнімі дэлегацыямі. Совецкая дэлегацыя не магла разглядаць раззбраенне, як самастойную самамэтную задачу, служачую толькі эканамічным, бюджэтным, агітацыйным або іншым мэтам. Мы хацелі бачыць у раззбраенні найбольш сапраўдны сродак скасавання інстытута вайны, канкрэтнага ажыццяўлення той ідэі, якая ляжа ў далейшым у аснову падпісанага ўсімі дзяржавамі свету пакта Брыяна-Келога аб адмаўленні ад вайны ў якасці зброі вырашэння міжнародных сарэчаў.

Мы лічылі і лічым, што сапраўднае адмаўленне ад вайны не можа быць эфектыўным без поўнага адмаўлення ад узбраенняў, што пакуль існуюць узбраенні, не можа быць забяспечан мір, што магчым толькі адзін від міру, гэта мір раззброены і што ўзброены мір ёсць толькі перамір'е, інтэрвал паміж войнамі, прынцыповае і фактычнае самакрыжаванне вайны і адмаўлення прынцыпа, праведзенага ў пакце Брыяна-Келога.

Вось чаму совецкая дэлегацыя пачала з прапановы поўнага ўсеагульнага раззбраення. Прынцыпе гэтай прапановы загаддзя ўстраніла-б шматлікія разгалоссі, узнікшыя на канферэнцыі па пытанню аб падзеле ўзбраенняў на абарончыя і наступальныя, аб крытэрыях безапаснасці, аб розных формулах скарачэння, аб роўнаправі ва ўзбраеннях і ў асаблівасці аб кантролі і т. д.

Прынцыпе совецкай прапановы, дадаю я, магло-б папярэдзіць мноства сумных палітычных з'яў, меўшых месца з таго часу ў пасобных краінах, абвастрэнне нацыяналізма, шавінізма, мілітарызма і не асталося-б без уплыву і на міжнароднае эканамічнае становішча.

Мы выступілі са сваёй прапановай у галы росквіту так званай нацыянальнай ідэалогіі, дазваляўшай многім верыць у немагчымасць вайны, па крайняй меры ў бліжэйшым будучым. Совецкая дэлегацыя, аднак, тады-ж прадбачыла і прадказвала немінучасць і блізкасць наступлення паласы новых войн і таму настойвала на хутчэйшым прыняцці радыкальных мер папярэджання гэтых войн. Я думаю, што калі-б народы, меўшыя тады большы ўплыў на палітыку сваіх урадаў, чым цяпер, таксама ясна б [illegible] пачаўшаяся развіццё міжнароднага палітычнага жыцця, то яны не дазволілі-б канферэнцыі так лёгка адвярцецца ад совецкай прапановы аб поўным раззбраенні.

На жаль, нашай прапанове ўспрацівіліся ўсе іншыя дэлегацыі, за выключэннем, здаецца, турэцкай, прычым выходзілі яны з таго, што пытанне аб вайне і міры не з'яўляецца актуальным, што гісторыя дае нам дасяцігоднія тэрміны для вырашэння пытання аб гарантыях міру доўгімі этапамі і гомеапатычнымі дозамі.

Мы як і раней і яшчэ больш чым раней упэўнены ў тым, што калі на роды пасля, можа быць, цяжкага катастрафічнага вопыта зноў вернуцца к думцы аб адшуканні міжнародных сродкаў прадухілення войн шляхам раззбраення, то яны не змогуць не ўспомніць аб совецкай прапанове аб поўным раззбраенні і сур'ёзна заняцца ёю, бо пакуль захоўваецца сучасная социяльна-эканамічная сістэма несовецкіх дзяржаў, другой гарантыі міру няма.

Адзначанае мной прынцыповае разгалоссе не магло, аднак, прыпыніць работы канферэнцыі, бо совецкая дэлегацыя не высоўвала сваёй прапановы ультыматыўна і заявіла аб сваёй гатоўнасці супрацоўнічаць з астатнімі дэлегацыямі таксама ў распрацоўцы сістэмы частковага скарачэння ўзбраенняў. Але тут-то пачаліся сапраўдныя затрудненні. У той час, як совецкая дэлегацыя заявіла аб прыймальнасці для яе любой меры скарачэння, пашыраючайся па любыя віды ўзбраенняў, разгалоссі ўзніклі паміж астатнімі дэлегацыямі. Спрэчкі вяліся перш за ўсё аб тым, ці трэба скарачаць існуючыя ўзбраенні, ці абмежаваць іх сучасным узроўнем.

Хоць адзін час здавалася, што гэта спрэчка вырашана галасаваннем канферэнцыі на карысць скарачэння ўзбраенняў, мы цяпер знову маем перад сабой прапанову толькі аб абмежаванні ўзбраенняў. У выпадку-ж скарачэння ўзбраенняў да гэтага часу няма аднагалосся аб меры, а таксама аб прынцыпе і крытэрыі гэтага скарачэння. Няма адзінай устаноўленай думкі аб тым, ці павінна скарачэнне ахапляць усе віды ўзбраенняў—сухасенныя, марскія і паветраныя, ці толькі некаторыя з іх. Намячалася як быццам рашэнне аб поўнай забароне паветранай бамбардыроўкі, з чаго лагічна выцякала неабходнасць скасавання самой зброі бамбардыроўкі.

Але і тут мы натыкаемся на прапанову аб захаванні гэтай зброі, але з абмежаваннем яе дзейнасці ў пэўных раёнах і са спецыяльнымі мэтамі. Як быццам можна здавальняцца навешваннем на бамбавозы плакатаў, як на чыгуначныя вагоны, з указаннем прабегу «Остэндэ—Інтэрлак», «Курыць забараняецца». Далёка небезапасна стаіць справа з кантролем. Я не стану пералічваць мноства іншых разгалоссяў. Даволі сказаць, што ні па аднаму намечанаму на канферэнцыі пытанню няма не толькі канкрэтных рашэнняў, але няма нават тэарэтычных формул, на якіх зышліся-б усе дэлегацыі.

Да гэтага трэба дадаць, што палітычныя падзеі не чакалі канца спрэчак у Жэневе і пашлі сваім ходам. У пасобных краінах мяняліся ўрады, мяняліся партыі, якія стаяць ва ўладзе, мянялася ідэалогія партый і ўрадаў, мяняліся іх метады вырашэння міжнародных пытанняў. Не гледзячы на прынятае ўсімі дзяржавамі ў сілу пакта Брыяна-Келога міжнароднае абавязацельства аб адмаўленні ад вайны ў якасці зброі нацыянальнай палітыкі, мы з'яўляемся сведкамі метадаў правядзення нацыянальнай палітыкі якраз шляхам развіцця ваенных дзеянняў на тэрыторыі суседніх дзяржаў. Іншыя дзяржавы, не маючыя яшчэ дастатковай сілы для правядзення падобнай палітыкі, абмяжоўваюцца пакуль славеснай і пісьмовай прапагандай ідэі экспансіі і захвату чужых зямель узброенай рукой, прычым яны «папераджальна называюць тыя краіны, на якія яны збіраюцца нападаць у першую чаргу. Ці прыходзіцца здзіўляцца, што дзяржавы, якія зацікаўлены ў захаванні міру, сугуба настаражыліся і праяўляюць яшчэ большыя хістанні, чым раней, у пытанні раззбраення. Аказаўся пахіснутым прыняты было ўжо канферэнцыяй прынцып роўнаправя ва ўзбраеннях. Нельга пярэчыць супроць роўнаправя, калі ўсе дзяржавы аднолькава актыўна, няхай хоць-бы на словах і прыняццем адпаведных міжнародных абавязацельстваў, імкнуцца да захавання міру.

Але пытанне стала, як быць з такімі дзяржавамі, кіраўнікі якіх зусім адкрыта напісалі ў сваёй праграме заваяванне чужых зямель (шляхам вайны, вядома, бо добраахвотна ніхто зямлі не аддае) і калі абстрактнаму прынцыпу роўнаправя процістаяць зусім рэальныя небяспекі яго прымянення.

Я гэта гавару зусім не для таго, каб зрабіць вывады аб роўнаправі ці няроўнаправі ўсіх дзяржаў у адносінах узбраення. Гэта пытанне перад совецкай дэлегацыяй не стаіць, бо яно выцякае з дакументаў, да якіх совецкі ўрад адносін не мае. Больш таго, гэта пытанне, паколькі яно ставіцца ў аспекце даўзбраення каго-б там ні было, не можа мець адносін да канферэнцыі па раззбраенню або па скарачэнню ўзбраенняў. Я хацеў толькі ўказаць на новыя настроі, узнікшыя ў рэзультаце вядомых палітычных падзей, якачна ўскладніўшых работу канферэнцыі, якая і без таго сустрэлася з велізарнымі затрудненнямі. І варта, падводзячы вынікі больш чым 2-гадовай работы канферэнцыі, мы павінны адкрыта сказаць, што намеціўшыяся ўжо на зары не жыцця затрудненні, не змякчаліся з цягам часу, а наадварот ішлі крэсцэндо, завёўшы нас, урэшце, у тупік.

Сапраўды, якія выхады мы бачым перад сабой. Выхаду не было тады, калі закрылася апошняя сесія генеральнай камісіі і закрылася яна таму, што не было выхаду. Сёй-той ускладаў надзеі на намеціўшыяся перагаворы ў вузкім коле некалькіх дзяржаў, але пагадненне не адбылося і ў такім вузкім коле. Па крайняй меры перад намі няма такога праекта рашэння, на якім змаглася-б усе ўдзельнікі гэтых перагавораў. А калі-б такое пагадненне існавала, то наўрад ці далучыліся-б да яго ўсе астатнія дзяржавы або велізарная большасць дзяржаў, якія у перагаворах не прымалі ўдзелу. Мы ведаем заявы некаторых дзяржаў, і зусім не з малых і зусім не страдаючых лішкам міралюбнасцю — што яны не пойдуць ні на якую меру скарачэння ўзбраенняў, праяўляючы пры гэтым сапраўдную агрэсіўнасць. Адных гэтых заяў даволі, каб зарэгістраваць поўную няўдачу канферэнцыі паколькі гэта датычыць раззбраення.

Тут, можа быць, знойдуцца дэлегацыі, якія прапануюць нам задаволіцца крупіцамі мер, якія хоць мала агульнага маюць з раззбраннем, але ўсё-ж на канферэнцыі закраналіся. Напрыклад, лішні раз пацвердзіць тое, што ўжо прынята ў якасці міжнародных абавязацельстваў, як забарона хімічнай вайны, або зноў пацвердзіць непавелічэнне ўзбраенняў звыш сучаснага ўзроўню. Але хто можа верыць, што падобнае абавязацельства сапраўды будзе ўсімі выконвацца ў сучасных умовах і што абавязацельства можа быць эфектыўна кантраліруема. Калі гэта так, то ці не будзе палітычна больш чэсна і больш мужна адкрыта прызнаць, што міжнароднае жыццё, у асаблівасці палітычныя падзеі ў некаторых краінах за апошнія гады не дазволілі канферэнцыі выкапаць не прамую задачу і выпрацаваць канвенцыю раззбраення.

Я не хацеў-бы каб мяне кепска зразумелі. Совецкая дэлегацыя не змяніла ні адной іоты ў сваіх адносінах да справы раззбраення, якой яна па-ранейшаму прадаўжае надаваць найвялікшае значэнне. Мы зусім не прапануем адмовіцца ад далейшага абмеркавання праблемы раззбраення. Мы яшчэ менш самі робім пярэчанні супроць той ці іншай схемы раззбраення, якую прынялі-б астатнія дзяржавы і, у прыватнасці, нашы бліжэйшыя суседзі. Няхай нам прадставяць такую схему, здольную атрымаць падтрыманне ўсіх дэлегацый. Але-ж яе няма. Нам не ўказвалі на яе ні паважаны прэзідэнт, ні папярэдні аратар. У мяне няма падстаў чакаць, што наступныя аратары ўнясуць новыя схемы, новыя прапановы, і што гэтыя прапановы спаткае лепшы лёс, чым раней абмяркоўваемыя намі прапановы. Вось чаму мы вымушаны канстатаваць вывіўшуюся бесрэдметнасць такой дыскусіі аб раззбраенні пры адсутнасці якіх-бы там ні было прапаноў, маючых шансы на універсальнае прыняцце. Не можам-жа мы займацца дыскусіяй дзеля дыскусіі, або тварыць малітвы за раззбраенне. Мы не хочам закрываць вачэй, як-бы непрыемна гэта не было, і мы робім з стварыўшагася становішча рэчаў няўхільныя вывады.

Са сказанага мною лагічна як быццам выцякала-б неабходнасць закрыцця самой канферэнцыі. Гэта было-б правільна, калі падыходзіць к пытанню з чыста фармальнага, педантычнага пункту гледжання, маючы на ўвазе толькі назву канферэнцыі. Але совецкая дэлегацыя, як я ўжо ўпамяную, прадаўжае зыходзіць з больш шырокай канцэпцыі канферэнцыі, як маючай сваёй задачай шляхам раззбраення ажыццявіць адну з гарантый міру. Стала быць, справа не ў самым раззбраенні, якое з'яўляецца толькі сродкам, а ў гарантаванні міру. А калі гэта так, то само сабой напрошваецца пытанне, ці не можа канферэнцыя напачупаць другія гарантыі міру, ці на крайняй меры павялічыць меры безапаснасці тых дзяржаў, якія не маючы агрэсіўных замыслаў, не зацікаўлены ў вайне, і якія ў выпадку вайны могуць таму стаць толькі аб'ектамі нападу.

Мяне могуць запытаць, якія гарантыі, што ў другіх пытаннях канферэнцыі будзе больш аднадушна, чым у пытаннях раззбраення і што новая дзейнасць канферэнцыі будзе таму больш пладатворнай і пасяховай. На гэта я адкажу. Для ажыццяўлення якой-бы там ні было меры скарачэння ўзбраенняў неабходна безумоўная згода амаль усіх дзяржаў, і справа можа сарвацца з-за нязгоды хоць-бы адной большмеш значнай, і ў асаблівасці, буйнай дзяржавы. Для ажыццяўлення-ж другіх мер безапаснасці аднагалоснасць не патрабуецца. Вядома, канферэнцыя павінна зрабіць ўсё, што ад яе залежыць, каб да гэтых мер далучыліся ўсе дзяржавы. Я спадзяюся, што так і будзе, што ўласныя інтарэсы нават не спачуваючых гэтым мерам дзяржаў не дазволяць ім выключыць сябе з агульнай сістэмы гэтых мер. Але калі-б нават аказаліся сярод дзяржаў дысідэнты, то гэта ні ў якім разе не павінна перашкодзіць астатнім ішчэ больш згуртавацца, каб правесці мерапрыемствы, якія павялічаць іх уласную безапаснасць.

Пытанні безапаснасці зусім не чужды канферэнцыі. Яна склікала нават для гэтых пытанняў спецыяльную палітычную камісію. Больш таго, яна займалася ўжо гэтымі пытаннямі, праўда, не давёўшы іх да канца.

Я напамінаю ў першую чаргу аб совецкай прапанове аб вызначэнні агрэсіі, прынятай ужо адной з камісій канферэнцыі, ажыццёўленай ужо ў радзе міжнародных дагавораў. Далейшае павелічэнне прыхільнікаў совецкага азначэння агрэсіі значна аблегчыла-б правядзенне другіх унесеных на канферэнцыі прапаноў, датычных безапаснасці. Могуць быць унесены, нарэшце, і новыя прапановы таго-ж парадку, як, напрыклад, аб тых ці іншых санкцыях супроць парушальнікаў міру або парушальнікаў пакта Келога. Можна ўстанавіць градацыю гэтых санкцый, не даводзячы яе да ваенных мерапрыемстваў, не для ўсіх дзяржаў прыймальных. У дадатак к такому больш ці менш універсальнаму пакту могуць быць ішчэ паасобныя рэгіянальныя пакты ўзаемнай дапамогі, прапанаваныя тут у свой час французскай дэлегацыяй. Справа не ідзе аб ваенных саюзах, аб падзеле дзяржаў на варожыя адзін аднаму лагеры, яшчэ менш аб чым-небудзь акружэнні. Мы не павінны стварэць такіх універсальных пактаў, у якіх не маглі-б прымаць удзел усе жадаючыя, ні рэгіянальных пактаў, у якіх не былі-б прыцягнуты ўсе зацікаўленыя ў безапаснасці ў даным раёне.

У мерах безапаснасці гэтага роду прынцып роўнаправя для ўсіх без выключэння дзяржаў не можа выклікаць ніякіх сумненняў ці хістанняў. Калі мы пойдзем па гэтаму шляху, то час і энергія, патрачаныя на канферэнцыю, не прападуць даремна, і мы не вернемся з пустымі рукамі к народам, паслаўшым нас сюды. І хто ведае, быць можа, умацаванне безапаснасці і тое ўздзеянне, якое яно аказа на агрэсіўна настроеныя ўрады, створаць такія ўмовы, пры якіх можна будзе з большымі шансамі на поспех зноў вярнуцца да праблемы раззбраення.

Як бачыце, я зусім не прапінаставляю безапаснасць раззбраенню і зусім не прапаную выключыць раззбраенне з праграмы работ канферэнцыі. Тое, што адносіцца к сістэме гарантый міру, а ў асаблівасці раззбраення, павінна быць прадметам клопатаў канферэнцыі, але кожнае пытанне павінна ставіцца тады калі яно мае шансы на вырашэнне. Сёння гэта можа быць безапаснасць, заўтра — раззбраенне.

Я прашу прабачэння за частае ўжыванне слова «безапаснасць», якое многім з нас прадстаўляецца антаганістам раззбраення, але я другога падыходзячага тэрміна не знаходжу для выражэння таго, што разумеецца пад словам «безапаснасць».

Але я зусім не хацеў-бы абмежаваць канферэнцыю ні ў яе задачах, ні ў часе. Я прапаную куды больш, а імена — ператварэнне канферэнцыі ў пастаянны орган, які ўсімі мерамі клапоціцца аб ахове безапаснасці ўсіх дзяржаў, аб ахове ўсеагульнага міру. Інакш кажучы, я прапаную ператварыць гэту канферэнцыю ў перманентную, перыядычна збіраючуюся канферэнцыю міру. Да гэтага часу мірныя канферэнцыі склікаліся пераважна пасля войн і мелі на мэце дзельбу здабычы вайны, навязванне пераможаным цяжкіх і ўніжальных умоў, перараз-меркаванне тэрыторыі, перакройванне дзяржаў, сеялі такім чынам зародкі новых войн. Канферэнцыя-ж, якую я маю на ўвазе, павінна быць стзорана для папярэджання вайны і яе цяжкіх вынікаў. Яна павінна выпрацоўваць, расшыраць і ўдасканальваць метады ўмацавання безапаснасці, своечасова адгукваць на перасцярогі аб надыходзячых ваенных небяспеках, на прызыў аб дапамозе, на «СОС» пагражаючай дзяржаўі і аказваць апошнім своєчасовую пасільную дапамогу, няхай гэта маральная, эканамічная, пасавая ці іншая.

Я прадбачу ўказанні і спасылкі на Лігу нацый, якая абавязана, у тыкулами 12, 15, 16 і іншымі статута служыць тым мэтам, дзе я хачу накіраваць работу канферэнцыі. Але, па-першае, Ліга нацый мае мноства задач, яна займаецца многімі справамі, буйнымі і малымі; яна была створана ў момант, калі небяспека вайны многім здавалася выключанай на многія гады. І пер-жа, калі небяспека вайны перанашымі вачыма, можна было-б думаць аб стварэнні спецыяльнага органа, накіраванага ў сваёй дзейнасці на адну мэту, у бок прадухілення або змяншэння небяспекі вайны. Па-другое, Ліга нацый занадта звязана са сваім статутам. Зварот да яе і вынясенне рашэнняў занадта строга рэгламентаваны, часам як трыбуну канферэнцыі можна было-б зрабіць больш даступным, больш свабоднай, больш адзыўлівым на патрэбы моманта. Няхай канферэнцыя прадаўжае лічыцца органам Лігі і ёю абслугоўваецца, няхай яна будзе самым цесным чынам звязана з ёю, няхай яна зусім не заміняе Лігі нацый, якая поўнасцю захавае свае прэрагатывы. Я цалкам уяўляю сабе трудасці стварэння новай міжнароднай арганізацыі, а сім адарванай ад Лігі і канкуруючай з ёю, я гэтага ні ў якім разе не прапаную. Але-ж самае склікання міжнароднай канферэнцыі па раззбраенню даказвае недастатковасць рамак Лігі для такіх буйных задач, як раззбраенне, а ў маёй прапанове справа ідзе аб яшчэ больш буйных задачах — аб перманентнай аховe міру.

Гаспада, я другой альтэрнатывы не бачу. Канферэнцыя па раззбраенню была створана ў момант, калі многім вайна здавалася яшчэ толькі тэарытычнай магчымасцю. Ці можа і ці павінна канферэнцыя зусім закрыцца, знікнуць бясследна? Ці можам мы спакойна разыйсціся па дамах з усведамленнем невыкананага доўгу пяпер, калі небяспека крывапралітнейшай вайны або хутчэй раду такіх войн пагражае ўсім кантынентам, усяму чалавецтву?

Мала ёсць цяпер дзяржаў, якія могуць лічыць сябе па-за гэтай небяспекай. Гэта небяспека можа абкрануць адных раней, другіх пазней, але ад яе не ўйсці. І ведаем, што ёсць палітыкі, уся мудрасць якіх заключаецца ў тым, каб пракладваць гэтай небяспецы шляхі ў бок ад сябе, у надзеі, што, выбраўшы адзін напрамак, гэта небяспека яго ніколі не зменіць. Дарэмныя надзеі. Гісторыя не ведае такіх выпадкаў, калі імперыялістычныя дзяржавы схільныя к заваяванням і расшырэнню свайго панавання, абмежаваліся толькі адну страну свету — поўдзень, захад, усход або поўнач. Умацаваўшыся ў адным напрамку, яны з памацнеўшымі і павялічанымі сіламі кідаліся на новыя заваяванні ў другіх, а часцей за ўсіх усіх напрамках. Перад тварам такой небяспекі ні адна дзяржава з інтарэсам самазахавання не можа думць рукі і адмовіцца ад супрацоўніцтва ў агульнай міжнароднай справе прадухілення гэтай небяспекі. Прынцыпам эфектыўных мер безапаснасці мы аказжам услугу не толькі сваім уласным народам, але і тым народам, якія супроць уласнай волі могуць быць кінуты дзеля чужых ім мэт і наперакор сваім сапраўдным інтарэсам у агонь авантурніцкіх крывавых эксперыментаў.

Совецкі ўрад не без гордасці адлядваецца на тыя меры безапаснасці, якія па яго ініцыятыве прадзены за апошнія гады ў асаблівасці ішчэйшай яго частцы Ўсходняй Еўропы. Шляхам пактаў аб ненападзенні агрэсіі, пактаў аб ненападзенні і прадоўжаннем іх на максімальны тэрміны совецкаму ўраду ўдалося ўмацаваць узаемнае давер'е з вялікай большасцю сваіх суседзяў. Ён прыдумаў новы від пакта і дэкларацый, якія, я спадзяюся, знойдуць у далейшым шырокае практычнае распаўсюджанне, — пактаў і дэкларацый моцных дзяржаў, якія гарантуюць незалежнасць размешчаных паміж імі або паблізу ад іх больш слабых дзяржаў.

Не заўсёды совецкі ўрад меў поспех у гэтых сваіх пачынаннях і не заўсёды знаходзіў водгук у тых дзяржаў, да якіх ён звяртаўся. Але і ў такіх выпадках совецкія прапановы саслужылі сваю службу міру, бо дапамагалі выявіць тыя пункты, дзе можна чакаць парушэння міру. Але совецкі ўрад гатоў унесці сваю лепту ў больш шырокія меры прыемствы па ахове ўсеагульнага міру, і гэта супрацоўніцтва ў той ці іншай міжнароднай справе, у той ці іншай міжнароднай арганізацыі нясе з сабой агромадную маральную сілу магутнай і мацнеючай 170-мільённай дзяржавы, канчаткова парваўшай з агульным прошлым ваенных заваяванняў, захватаў і алексіі і на працягу 16 год свайго новага існавання даўшай багатыя доказы сваёй шчырай міралюбнасці.

* *

Прамова т. Літвінава, якая прадаўжалася 40 мінут, слухалася ўвесь час з неаслабнай увагай і зрабіла велізарнае ўражанне. Канец прамовы быў пакрыт апладысментамі раду дэлегацый, на лавах прэсы і ў публіцы.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЗЛАМАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ НАСТРОІ БЛАГАДУШНАСЦІ І САМАСУПАКОЕНАСЦІ

НЕ ТРАЦІЦЬ НІ АДНАГО ДНЯ. НЕ ДАПУСКАЦЬ НІ АДНАГО ПРАГУЛУ. ПАЛОЦЬ ЛЁН І ЗЕРНАВЫЯ, УЗНІМАЦЬ ПАПАР І ЦАЛІНУ, ПАЧАЦЬ СЕНАЎБОРКУ, РАЗГОРТВАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРКІ, ПАПРАЎЛЯЦЬ ДАРОГІ, УДАРНЫМІ ТЭМПАМІ ВЫВОЗІЦЬ ЛЕС І ДРОВЫ

УСЯКАЕ АСЛАБЛЕННЕ ТЭМПАЎ—ПАГРОЗА ВЫСОКАМУ ЎРАДЖАЮ

СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР

ВОРНА ПРАВЕСЦІ СЕНАКАШЭННЕ І СЕНАЎБОРКУ

Савет Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіў план сенакашэння і сенаўборкі на 1934 г., зроблены Наркамземам СССР і Наркомсоўгасаў, у размеры 54 млн. гектараў, у тым ліку па калгаснаму сектару 41.596 тыс. гектараў і па соўгасах 12.404 тыс. гектараў.

Соўнаркомам саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам прапанавана давесці план сенакашэння і сенаўборкі да раёнаў, сельсоветаў, калгасаў і соўгасаў як па плошчы, так і колькасці сена, а таксама распаціць дадатковы план на другі ўкосу з улікам асаблівасцей асобных раёнаў. Апрача таго, для арганізацыі павінны ў 10-дзённы тэрмін закончыць адвод сенасных участкаў калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам.

У мэтах барацьбы са стратамі сенаўборцы і павышэння якасці сена соўгасы, калгасы і аднаасобныя гаспадаркі абавязаны весці сенаўборку да разгортвання ўборкі каласавых хлябоў, дапускаючы перастою траў і розыву паміж сенакашэннем і сушэннем.

Мясцовым органам і праўленням калгасаў даручана пры ўсталёўванні плана сенаўборкі ўлічыць патрабнасць у кармах не толькі аграмаджанага стада калгаса, але і жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў. Пры гэтым частка сенасаў можа быць размяркована між калгаснікамі.

Калгаснікам, атрымаўшым сенакосныя ўчасткі для індывідуальнага сенакашэння, у асаблівасці лепшым ударнікам, павінна быць аказана дапамога ў перавозцы сена.

Для павышэння зацікаўленасці калгаснікаў у правядзенні сенаўборачных работ Соўнарком Саюза ўстанавіў, што калгасная брыгада, перавыконаўшая план сенаўборкі, атрымлівае накошанае ёй звыш плана сена ў сваё распараджэнне для размеркавання яго па працадзнях сярод калгаснікаў брыгады. Размеркаванне сена сярод калгаснікаў, якія маюць жывёлу і нанава набываюць жывёлу, па працадзнях праўленні калгасаў павінны правесці па сканчэнні сенаўборкі, пасля выканання плана здачы дзяржаве сена па кантрактацыі і стварэння фонду грубых кармоў для аграмаджанага стада калгасаў.

Раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія советы абавязаны аказваць дапамогу аднаасобнікам у справе арганізаванага правядзення сенаўборкі са скарыстаннем наяўнага ў аднаасобнікаў сенакоснага інвентара і цягавай сілы.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР звярнуў увагу совецкіх органаў на тое, што сенаўборачная кампанія бягучага года з'яўляецца важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй для забеспячэння пад'ёму жывёлагадоўлі, і прапанаваў Наркамзему СССР, Наркомсоўгасаў і ўсім совецкім органам забяспечыць поўнае і своечасовае выкананне плана сенаўборкі.

Аб скарыстанні лугоў і выпасаў

Совет Народных Камісараў Саюза ССР дазволіў калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам, а таксама рабочым і служачым, якія пражываюць у гарадах і прыгарадах і маюць сваю жывёлу, праводзіць перашкодную і бясплатную сенажаць на землях, належачых соўгасам і не скарыстоўваемых імі, на землях дзяржаўнага земельнага фонду, а таксама ў лясах дзяржаўнага і мясцовага значэння.

Апрача таго, гэтым гаспадаркам дазволена бясплатна пасвіць жывёлу на землях, належачых соўгасам і не скарыстоўваемых імі для патрэб сваёй гаспадаркі, і на землях дзяржаўнага земельнага фонду.

Адвод сенакосных участкаў на землях соўгасаў робіцца начальнікам раённага земельнага аддзела па згодзе з дырэктарамі соўгасаў. Касьба ў лясах дзяржаўнага і мясцовага значэння робіцца па згодзе з начальнікамі леспрамгасаў. Сенакашэнне на дзяржаўных землях дазваляецца непасрэдна начальнікам райземаддзела.

Праполка не арганізавана

ГАВУСЫ, 29.

Праполка зерневых і ільну ў гаўскім раёне праходзіць вельмі дрэнна. Усходы яравых і азімых пакрыліся густой сеткай пусцелля. Сурэпка заглушае пасевы ячменю.

Прыкладна, у соўгасе «Ялова» сеянае поле ячменем прадстаўляе суцэльнае мора жоўтых кветак сурэпкі. Да праполкі ў гэтым соўгасе прыступілі толькі гэтымі дні. Праполаны лічаныя гектары.

Тое самае і на другіх калгасах раёна. Такія сельсоветы, як Пуцькаўскі і Халмоўскі да праполкі не прыступілі зусім, а ў калгасах Даўгамоскага, Дужаўскага, Радамльскага і іншых сельсоветаў праполавана ўсяго ад 1,5 гектара да 2 гектараў.

У вогуле па раёну праполавана на 25 мая 1783 га зерневых (план праполкі 21.812 гектараў) і ільну 580 га (план 7200 гектараў).

Горшае становішча па аднаасобнаму сектару. Тут аб праполцы нават і не думаюць. Райземаддзел слаба кіруе ходам гэтай работы.

П. С.

ПОСПЕХ РАШЫЛА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЗДЗЕЛЬШЧЫНА

БАРЫСАЎ, 28. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Калгас «Маяк социялізма» сёлета выпаў у рады перадавікоў. Ён да 1 мая — на цэлы месяц раней і на 18 гектараў больш чым у мінулым годзе —, выканаў план пасеву яравых культур.

За выдатнае правядзенне сяўбы калгас трымае пераходны сцяг РК КП(б)Б. Характэрна, што сяўба сёлета праведзена з меншай колькасцю работнікаў: летась працавала на полі 60 калгаснікаў, а сёлета 40. Тлумачыцца гэта ростам прадукцыйнасці працы калгаснікаў у рэзультаце правільнай арганізацыі палявой работы. Поспех сяўбы вырашыла звяно і асабліва індывідуальная здзельшчына, якая знайшла ў гэтым калгасе шырокае прымяненне.

Мінулы год ясна паказаў, што працаваць скопам выгадна толькі гультаю і бракароб, які жывіўся за кошт лепшых работнікаў калгаса. Летась у калгасе не было ні ўдарнікаў, ні гультаёў — усе работнікі былі «роўныя». Ураўнілаўка была неадлучнай спадарожніцай скопу.

Леташні горкі вопыт прымусіў сёлета калгас адмовіцца ад работы скопам. Гэтай вясной кожны калгаснік атрымаў персанальнае заданне і ўчастак. Гэта мерапрыемства з'явілася прычынай росту прадукцыйнасці працы на полі.

За выключэннем 2-3 чалавек усе аратыя падымалі адным параконным плугам у сярэднім 1 гектар глебы, у той час як у мінулым годзе гэтыя аратыя ледзь узорвалі менш паловы гектара.

Калгас на справе ўбачыў сваіх лепшых ударнікаў. Віцько Міхась і Шпак Іван, захоўваючы самую высокую якасць работы, узорвалі па 1,15—1,20 гектара глебы двухлямешным параконным плугам. Убачылі калгаснікі і твар гультаёў, якія раней прыкрываліся скопам. Летась Харэвіч Мікола быў «роўным» з другімі работнікамі брыгады, а сёлета ён усім вядомы, як бракароб і гультай. Камісія па якасці прымусіла яго лапатай пераканаць агрэгат на тым загоне, дзе ён араў. Такая-ж «бяда» напаткала і Ярмаша Владзіміра.

Рост прадукцыйнасці працы вельмі відавочны з наступнага параўнання: у мінулым годзе на засеве аднаго гектара яравых (зерневыя і бульба) было патрачана ў сярэднім 6,5 працадня, а сёлета толькі 5 працадзён. На кожны гектар з'эканомлена 1,5 працадня. Эканомячы працадні, калгас ідзе прамым шляхам да павелічэння вагі працадня і мае магчымасць выканаць усе палявыя работы ў тэрмін і высокаякасна.

У самым пачатку праполкі ў «Маяку социялізма» два разы прапалолі гароды і перапалолі больш паловы палявых пасеваў. Барануюць і акучваюць бульбу. Да сенаўборкі некаторыя пасевы будуць праполаты паўторна. Індывідуальная здзельшчына павінна быць яшчэ глыбей і шырэй укаранена ў часе ўборкі.

ЧЫКУН.

ЗМЯНІЛІСЯ АДНОСІНЫ ДА КАЛГАСНАЙ ПРАЦЫ

Наш калгас Дубаўцы ў мінулым годзе буксіравалі аж чатыры калгасы. Галоўнай прычынай нашага адставання была работа скопам, абязлічка, безадказнасць. Лодыр хаваўся за спіной ударніка. Коні былі збіты. Нормы не выконваліся.

Калгас вялікі—335 гектараў яравой пахаці. Летась мы сеялі на 55 гектараў менш, а план выканалі на 60 дзён пазней. Што-ж забяспечыла такі рэзкі пералом? Трэба сказаць, што галоўная прычына поспеху — індывідуальная здзельшчына, якую мы ўвялі ў гэтым годзе. Вось прыклады.

Калгаснікі Дзягелеў Ягор, Ільюшэнка Пётра, Стаселька Палікарп, Камлёў Сямён і шмат іншых, якія летась не ўзорвалі і 0,30 гектара, сёлета сістэматычна давалі 0,60—0,70 гектара ў дзень.

І коні добрыя. Ветэрынарны ўрач, агледзіўшы конскае пагалоўе пасля сканчэння пасеўнай, заявіў:

—Вельмі добры стан. Усе гарцуюць.

Чаму так здарылася, калі нагрузка на каня была 6,2 гектара сяўбы?

Паглядзіце на доглад. Па-першае, конюхі—лепшыя калгасныя ўдарнікі. Па-другое, яны атрымліваюць аўса ў дзень па 2 клг. і мукі па 2 кіло на балтанку. А галоўнае вось што. Кожны калгаснік сочыць, як яго конь даглядаецца.

Ястрабаў Антон, Стаселька Палікарп нават ноччу прыходзяць на канюшню і правяраюць, як кормяцца прымацаваныя да іх коні.

Вось што дае індывідуальная здзельшчына.

САНДЛЕР—
старшыня калгаса «Дубаўцы».

ВЫВЕЛІ ЛОДЫРАЎ

Прыслалі мне ў калгас «Буй» (Латыгаліцкі сельсавет) у красавіку гэтага года. Дысцыпліна ў калгасе была расхістана. На працу выходзілі ў 9 гадзін раніцы, да 2-х гадзін працавалі без перапынку. Коні марыліся. Нормы ў 25-30 сотак не выконвалі.

Увёў індывідуальную здзельшчыну. Былі пярэчанні з боку гультаёў, артачыліся, але большасцю свядомых калгаснікаў прынялі.

Сталі на працу выходзіць у 5 гадзін раніцы. У 9 гадзін перапынак. З 10 працавалі да 2-х гадзін. З 4 да 9 — зноў праца. Падкормку арганізавалі на полі. Мех сена вёз з сабой кожны калгаснік.

Спаборнічаць пачалі. А калі няма індывідуальнай здзельшчыны, не можа быць і спаборніцтва ўнутры звяна.

Лодыраў Сычова Макара, Падалінскага Паўлу спачатку не прымалі ні ў адно звяно. Потым і яны падцягнуліся. Пачалі выконваць нормы, нават перавыконваць.

Вось імёны лепшых ударнікаў, выявіўшыхся пасля ўвядзення індывідуальнай здзельшчыны: Кішковіч Паўла, Кішковіч Міхась пачалі ўзорваць ад 0.60 да 0,75 гектара ў дзень на адным кані.

Жанчыны Ермашкевіч Хадосся, Кантур Алеся, Рукаль Ліда — таксама не адставалі на палявых «мужчынскіх» работах; яны нязменна заносіліся на чырвоную дошку.

Цяпер людзі нашага калгаса, якіх раней лічылі лодырамі, паказваюць узоры працы, вучаць як трэба працаваць.

Недарма-ж наш сельсовет першым у раёне закончыў сяўбу, заваяваў пераходны чырвоны сцяг імя РК КП(б)Б. палітадзела і РВК.

ВАСІЛЕНАК НІКОЛА — старшыня калгаса «Буй».

Пустазелле заглушае ільняныя пасевы

ОРША. Праполка ільняных пасеваў у калгасе «Юны тварэц», Пугляеўскага сельсовета, не арганізавана. Старшыня калгаса тав. Куран з праполкай ільну не спяшаецца, хоць пасевы глушыць рознае пустазелле.

У апошнія дні пасля настойлівых прапаноў калгаснікаў тав. Курак паслаў калгаснік на праполку. Але там, дзе патрэбна паставіць 3-4 калгаснікі, паслаў ён 14 чалавек, а ў выніку адна перашкаджае другой і праполка зрываецца.

Нічога не робяць у калгасе для арганізацыі касьбы. Там, дзе трэба будзе касіць, зараз пасецца жывёла.

А. ШЗБЕКА.

НЕАСЛАБНА ПРАДАЎЖАЦЬ БАРАЦЬБУ З ШАВІНІЗМАМ

(Ад беларускага карэспандэнта «Праўды»)

Многія партыйныя і совецкія арганізацыі Беларусі зрабілі ў свой час рад памылак у практычным правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Памылкі выпраўляліся пасля непасрэднага ўмяшання ЦК ВКП(б). Так было і ў сакавіку мінулага года, калі пасля ўказання ЦК ВКП(б) ЦК Беларусі на спецыяльным пленуме асудзіў дапушчаныя некаторымі арганізацыямі Беларусі скажэнні ў нацыянальным пытанні.

У снежні мінулага года пленум ЦК Беларусі, у сілу стварыўшайся канкрэтнай абстаноўкі прызнаў, што «у даны момант у Беларусі галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі». У тым-жа рашэнні даволі ясна ўказана на неабходнасць барацьбы з шавінізмам усіх масцей, павышэння якасці масавай работы і інтэрнацыянальнага выхавання.

Прайшло паўгода. Аб рашэннях пленума амаль забылі. Замаўчаў і друк, і толькі зрэдку ў агульна-палітычных дакладах успамінаюць аб гэтым. Што-ж датычыць глыбокай штодзённай інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы, то яна ў рэспубліцы лічыцца ў вельмі сдабай ступені. Як быццам буржуазны беларускі нацыяналізм перастаў існаваць, як быццам ён ніцзе не праяўляе сябе.

Фактычнае стаговішча гаворыць зусім аб іншым.

У свой час усе школы ў Гомелі былі прымацаваны для палітхімзацыі к прадпрыемствам: яўрэйскія школы—к прадпрыемствам лёгкай прамысловасці, беларускія школы—к заводам цяжкай прамысловасці. Педагогі спабжаліся па спісах тых устаноў, да якіх школы былі прымацаваны. Такім чынам, настаўнікі яўрэйскіх школ спабжаліся па другому спісу, а педагогі беларускіх школ—па першаму спісу. Ужо два гады як школы адмацаваны ад прадпрыемстваў, а настаўнікі спабжаюцца па старому чрыцыпу. Два гады настаўнікі яўрэйскіх школ дабіваюцца ўраўнення іх у правах з настаўнікамі беларускіх школ. І ўсё безрэзультатна. Сакратар Гомельскага гаркома партыі тав. Шафарэнка разводзіць рукамі: «Я аб гэтым і не ведаў».

У мінулым годзе Соўнарком Беларусі зацвердзіў новы беларускі правапіс, ачышчаны ад уплыву буржуазнага беларускага нацыяналізма. Гэта мерапрыемства да гэтага часу сустракае супраціўленне мясцовых нацыяналістаў.

У браніславіцкай школе калгаснай моладзі, Жыткавіцкага раёна, настаўнік Перчэнкаў, сын кулака, на сходзе настаўнікаў выступіў супроць новага беларускага правапіса. «Правапіс не падыходзіць, —гаварыў ён,—гэта абрусенне беларускай мовы».

Такіх фактаў многа. Яны ўскрываліся з вялікім спазненнем. І ў большасці выпадкаў іх замоўчваюць і не скарыстоўваюць для павышэння пільнасці партыйна-совецкай грамадскасці.

Наша партыя надае асаблівае значэнне масавай палітычнай работе сярод працоўных розных нацыянальнасцей на іх роднай мове. Гэты ўчастак работы ў Беларусі запушчан.

У Менску 10 з дзішкам год існавалі 2 нацыянальныя клубы — польскі і яўрэйскі. Працавалі дрэнна, бо асаблівай увагі да іх не праяўлялі, іх не кіравалі. Але ўсё-такі сякая-такая работа вялася. У клубах былі бібліятэкі-чытальні, туды збіраліся рабочыя нацыянальных меншасцей. Часам праводзіліся гутаркі, лекцыі. У Менску нарашылі прыбліжць клубы к прадпрыемствам. Нарашылі мудра: клубы закрыць, а актыву разыйсціся на прадпрыемствах і «разгарнуць работу». У рэзультаце—ні клубаў ні работы. Па прыкладу Менска, сталі закрываць нацыянальныя клубы і ў раёнах.

Зусім зразумела, што надобныя адносіны да работы сярод нацыянальных меншасцей шанцуюць шавіністам праводзіць свае контрреволюцыйную работу.

У Барыскаве яўрэйскія клерыкалы нікі кацу ў першую чаргу... рабочым-ударнікам. Рэлігійны свяжак Хітрык раз'язджаў па пастэчках і вёў рэлігійных шавіністычныя песні ў сінагогах і клубах. Прычым у пастэчку Капаткевічы на «канцэрты» гэтага кракабоса прыходзілі камсамольцы і піонеры, а шавецкая сакатужная арцель з культурнага фонду выдала яму «за работу» грашовую ўзнагароду.

У Беларусі ёсць 40 нацыянальных польскіх сельсветаў. Але, не ўсюды работа праводзіцца на польскай мове. Польскі кулак і шавініст на ўсю скарыстоўваюць адсутнасць інтэрнацыянальнай работы сярод нацыянальнасцей. У Лагойскім раёне касцёл «працуе», а хата-чытальня—на замку.

Карэнізацыя з'яўляецца неадлучнай часткай ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэта азбучная ісцина большэвіцкай палітграматы сён-тэм слаба ўсвоена ў Беларусі. Гурткі беларускай мовы амаль ніцзе не працуюць.

Нярэдка ў раёнах і нават у цэнтральных установах аб беларусізацыі можна судзіць толькі па штампу і пачатцы.

Такое становішча, бясспрэчна, дапамагае буржуазным нацыяналістам і шавіністам. Ідэолаг беларускага кулака—нацыянал-дэмакрат зацікаўлен у зрыве большэвіцкага правядзення карэнізацыі.

Неабходна напомніць словы т. Сталіна, сказаныя ім на XVI з'ездзе партыі, што ў перыяд социялізма «нацыянальныя мовы не толькі не адмираюць і не зліваюцца ў адну агульную мову, а, наадварот, нацыянальныя культуры і нацыянальныя мовы развіваюцца і расцвітаюць».

На жаль, аб гэтым у Беларусі многія забываюць...

ЦК КП(б)Б, несумненна, выправіць памылкі, дапушчаныя пасобнымі арганізацыямі.

(«Праўда»). ВІГДАРОВІЧ.

Н. ЛЕЎКОВА

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ АСВЯТЛЕННЯ ПЫТАННЯЎ ГІСТОРЫІ КП(б)Б

Некаторыя крытычныя заўвагі па рабоце т. Зюськова „Большэвікі—арганізатары Окцябра ў Беларусі“)*

Далей аўтар зусім палітычна няправільна ставіць пытанне—можа ці нельга было аддзяляць Беларусь ад Расіі напярэдадні Окцябра, робячы гэту «праблему» цэнтрам у асвятленні нацыянальнага пытання. «Ці магла партыя, якая правільна паставіла пытанне аб самавызначэнні нацый, выстаўляць у гэтых умовах няпярэдадні пролетарскай рэволюцыі лозунг аб аўтаноміі або аб аддзяленні Беларусі? Не,—адказвае аўтар,—бо на яе ўлады была буржуазія і таму пастаноўка пытання дапамагла-б буржуазіі абманваць масы». (стар. 20, падкрэслена аўтарам). Такая пастаноўка пытання аўтарам не дае правільнага адказу аб большэвіцкім разуменні права нацый на самавызначэнне аж да аддзялення. Аўтар не разумее, што ленінскі большэвіцкі лозунг самавызначэння з'яўляўся ў той-жа час і астрэйшай зброяй у барацьбе з нацыяналістычным атручаннем працоўных мас прыгнечаных нацыянальнасцей і спрашчае, вульгарызуе вырашэнне большэвікамі нацыянальнага пытання. Справа заключаецца не ў праблеме аддзяляць ці не аддзяляць Беларусь або якую-небудзь другую нацыянальную акраіну б. Расіі ў часе Окцябра. Справа заключаецца ў забеспячэнні адзінага інтэрнацыянальнага фронта пролетарыята ўсіх нацыянальнасцей на тэрыторыі б. Расіі. Справа заключаецца ў тым месцы, якое займала нацыянальна-вызваленчая барацьба ў часе социялістычнай рэволюцыі. Справа заключаецца ў тым, каб правільна спалучыць пролетарскую барацьбу за дыктатуру пролетарыята з маабілізацыяй працоўных мас прыгнечаных нацыянальнасцей — інтэрэсах класавай барацьбы пролетарыята, правільна арыентуючы масы на адзіна магчымы шлях знішчэння нацыянальнага прыгнечання: гэта —перамога дыктатуры пролетарыята.

Ну, а як-жа з'аддзяленнем. Адзяляць ці не? На гэта мы маем адказ як у Леніна, так і тав. Сталіна. У пісьме да рабочых і сялян па поваду перамогі над Дзенікіным Ленін гаворыць: «Мы працаўнікі нацыянальнай варожасці, нацыянальнай рознасці, нацыянальнай абасобленасці. Мы—міжнароднікі-інтэрнацыяналісты. Мы імкнемся да цеснага аб'яднання і поўнага зліцця рабочых і сялян усіх нацый свету ў адзіную сусветную Совецкую рэспубліку» (том XXIV, стар. 656). У другім месцы таго-ж пісьма Ленін гаворыць: «Было-б адзінства ў барацьбе супроць ярма капітала за дыктатуру пролетарыята, а з-за пытання аб нацыянальных граніцах з федэратыўнай або другой сувязі паміж дзяржавамі комуністы разыходзіцца не павінны» (стар. 658). Ці не ясна? Здаецца, ясна. Навошта-ж было «мудраваць лукава» і выдумляць неіснуючыя праблемы? Неабходна было паказаць, што толькі большэвікі заўсёды давалі адзіна правільнае вырашэнне нацыянальнага пытання. Гэта большэвікі проціпаставілі метаду буржуазнага нацыяналізма, метаду «адпадзення нацый адна ад другой», метаду іх раз'яднання, метаду «ўзмацнення нацыянальнай варожасці паміж працоўнымі масамі розных нацый» (Сталін), г. зн. таму метаду, які прапагандавалі і імкнуліся ажыццяляць на справе ўсе беларускія і яўрэйскія контррэволюцыйныя нацыяналістычныя партыі, як БСГ, Бунд і т. д., пролетарскі інтэрнацыянальны метад «вызвалення прыгнечаных народаў, як адзіна правільны метад, паказаўшы на справе магчымасць і мэтазгоднасць брацкага саюза рабочых і сялян самых рознастайных народаў на пачатках добраахвотнасці і інтэрнацыяналізма» (Сталін). Характэрнай рысай Окцябрскай рэволюцыі і з'яўляецца, гаворыць тав. Сталін, што яна правяла ў СССР «нацыянальна-каланіяльныя рэволюцыі не пад сцягам нацыянальнай варожасці і міжнародных сутычак, а пад сцягам узаемнага давер'я і брацкага зліцця рабочых і сялян нацыянальнасцей СССР не ў імя нацыяналізма, а ў імя інтэрнацыяналізма».

Разам з гэтым трэба заўважыць такое-ж спрашчэнства ў асвятленні пытання аб бундаўскай культурна-нацыянальнай аўтаноміі. У выніку таго, што аўтар не зразумеў палітычнай класавай сутнасці культурна-нацыянальнай аўтаноміі, атрымалася падкрэсліванне, галоўным чынам, абаротнай старны сутнасці гэтага лозунга—змыканне яго з вялікадзяржаўніцкай імперыялістычнай буржуазіяй і выпаў амаль цалкам заалагічны яўрэйскі шавінізм Бунда.

Аднак, не толькі ў гэтым справа. На старонцы 37 аўтар гаворыць: «Сутнасць тэорыі нацыянальна-культурнай аўтаноміі заключаецца ў тым, што яна патрабуе гэтай аўтаноміі ў межах адзінай Расіі, такім чынам яна грае на руку вялікадзяржаўнікам (чаму з ёю і згадзіўся тагі вялікадзяржаўнік, як Троцкі)—гэта па-першае, а па-другое, яна аддзяляе пролетарыят адной нацыі ад другой і стварае ілюзіі, быццам ёсць нейкія адзіныя агульна-нацыянальныя інтарэсы і ў буржуазіі і ў пролетарыята адной нацыі. Таму тэорыя культурна-нацыянальнай аўтаноміі контрреволюцыйна».

У дадай фармулёўцы не гаворыцца ні адным словам аб класавай сутнасці гэтай тэорыі, а як вядома, справа заключаецца перш за ўсё ў тым, што «хто права або ускосна ставіць лозунг яўрэйскай «нацыянальнай культуры», той (яказы-б ні былі яго намеры) —вораг пролетарыята, прыхільнік старога і каставага ў яўрэйстве, данаможнік рабінаў і буржуа» (Ленін, т. XVII, стар. 139). Справа заключаецца ў тым, што лозунг нацыянальнай культуры пры панаванні буржуазіі ёсць лозунг рэакцыйны, мэта якога «атруціць масы ядам нацыяналізма і ўмацаваць панаванне буржуазіі» (Сталін), што лозунг «нацыянальнай культуры», на якім пабудавана праграма нацыянальна-культурнай аўтаноміі, ёсць «буржуазны (а часта і чорнасоценна-клерыкальны) абман» (Ленін).

Тады-ж «нацыянальная культура» наогул ёсць культура памешчыкаў, папоў, буржуазіі» (Ленін, т. XVII, стар. 137), а бундаўцы выступалі, як ахавальнікі і барацьбіты іменна за гэту чорнасоценна-клерыкальную і буржуазную культуру, абараняючы адзінства нацый і т. д. Адначасова трэба было сказаць, як буржуазны яўрэйскі шавінізм спалучаўся ў бундаўцаў з імперыялістычным тлумачэннем самавызначэння, калі ўжо і лідэры II інтэрнацыянала, права на самавызначэнне ператварылі ў права на культурную аўтаномію, што было ў інтарэсах імперыялізма. Можна было-б прывесці шмат прыкладаў, калі бундаўцы на справе праводзілі вялікадзяржаўную палітыку ў адносінах да Украіны, Беларусі.

Неабходна, аднак, падкрэсліць, што пасля Окцябрскай рэволюцыі ў мэтах барацьбы з дыктатурай пролетарыята, рэстаўрацыі капіталізма і імперыялістычнай інтэрвенцыі бундаўцы стварылі адзіны фронт з беларускай контрреволюцыяй (і таксама вялікадзяржаўнай), вітаючы стварэнне прэславутай Бел. нар. рэспублікі і выказваючы сваю гатоўнасць да абароны, а ў далейшым вялі разам з беларускай контрреволюцыяй падрыўную работу ў тых-жа мэтах. Класавую буржуазную сутнасць «культурна-нацыянальнай аўтаноміі», за якую крычалі, за якую бундаўцы змагаліся са зброяй у руках супроць рэволюцыі, супроць дыктатуры пролетарыята, і трэба было паказаць. Іменна гэта неабходна было падкрэсліць, іменна гэта неабходна было сказаць і аўтару работы «Большэвікі і арганізатары Окцябра ў Беларусі».

(ПРАЦЯГ. БУДЗЕ)

*) Працяг. Пачатак глядзі № № 18 і 116.

Начальнікі палітаддзелаў МТС, узнагароджаныя ордэнам Леніна. Злева направа т. т.: МАЙСЕЕЎ (Капыльская МТС), БАНГАЙЦІС (Слуцкая МТС), ВАЙМАН (Рагачоўская МТС) і КАМЕНШТЭЙН (Хойніцкая МТС).

ПРЫВІТАННІ ПАРТЫІ І УРАДУ АД НАЧАЛЬНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ, УЗНАГАРОДЖАНЫХ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

ЦК ВКП(б)—т. СТАЛІНУ ЦВК СССР—т. КАЛІНІНУ

Узнагарода ўрадам вышэйшай узнагародай—ордэнам Леніна—яшчэ больш натхняе нас на барацьбу за большэвіцкія калгасы і заможнае жыццё калгаснікаў. Падводзячы вынікі пасяховага правядзення весняной сяўбы ў Беларусі, у якой калгасы нашых МТС ішлі ў авангардзе, запэўняем вас, што і ў далейшай нашай рабоце, не шкадуючы сіл, будзем з усёй большэвіцкай настойлівасцю і рашучасцю змагацца за выкананне рашэнняў партыі і ўказанняў яе правадыра таварыша Сталіна.

Начальнікі палітаддзелаў МТС
Рагачоўскай ВАЙМАН,
Капыльскай МАЙСЕЕЎ,
Слуцкай БАНГАЙЦІС,
Хойніцкай КАМЕНШТЭЙН.

ЦК КП(б)Б—тав. ГІНАЛО Начальніку палітсектара МТС НКЗБ т. РАТНЕКУ

Узнагародай прэзідыумам ЦВК СССР 110 начальнікаў палітаддзелаў, у тым ліку і нас вышэйшай узнагародай — ордэнам ЛЕНІНА — партыя Леніна—Сталіна і ўрад вялікай краіны Саветаў яшчэ раз высока ацанілі работу палітаддзелаў па перавыхаванню шырокіх мас калгаснікаў у социялістычным духу, па ўмацаванню калгаснага ладу і ўздыму сельскай гаспадаркі.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб тым, што наш вопыт станоўчай партыйна-арганізатарскай работы на вёсцы павінен стаць здабыткам усіх партыйных арганізацый і палітаддзелаў Беларусі, абавязвае нас працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш аддана. Будзем моцна біцца за большэвіцкі поспех далейшых сельска-гаспадарчых работ, за большэвіцкія калгасы і заможнае культурнае жыццё калгаснікаў. Заклікаем усе палітаддзелы і партыйныя арганізацыі большэвіцкай работай дабіцца, каб БССР —фарпост СССР на рубяжы двух светаў—стала ўзорнай ордэнаноснай рэспублікай.

Начальнікі палітаддзелаў МТС: Рагачоўскай ВАЙМАН,
Хойніцкай КАМЕНШТЭЙН,
Капыльскай МАЙСЕЕЎ,
Слуцкай БАНГАЙЦІС.

Аператыўна і па-дзелавому штодня кіраваць здабычай торфу („Правда")

Крута ўзняць тэмпы здабычы

Ацэнка работы тарфяной прамысловасці БССР, даная ў перадавым «Праўды» ад 20 мая, з'яўляецца вялікім дакорам асабліва для торфаарцелей. Яны працуюць яшчэ горш, чым торфазаводы.

Не гледзячы на цэлы рад дырэктыў ЦК КП(б)Б і спецыяльную тэлеграму тав. Гінало і Галадзеда аб прыняцці мер і аказанні дапамогі торфаарцелям раённымі арганізацыямі, Уваравіцкія, Церахаўскія і Гомельскія раённыя арганізацыі часткі яўна недаацениваюць работу торфарцелей. На 20 мая па Уваравіцкаму раёну з агульнага сезоннага плана ў 22 тыс. тон здабыта ўсяго 381 тона торфу, што складае 1,7 проц. плана. Гэта зусім не трывожыць сакратара райкома тав. Фрыдмана і старшыню РВК тав. Ісачанко. Яны-ж вынеслі пастанову аб падрыхтоўцы да торфасезону яшчэ 23 дакліка, «намецілі», «даручылі», але гэта пастанова да сёнешняга дня не выканана, бо ніхто яе не правяраў.

У раёне праяўляюцца яўна кулацкія вылазкі, на якія своечасова не рэагуецца (вёска Чырвоная горка, Сталінскага сельсовета). На торфараспрацоўкі ніхто не выходзіць.

Па Церахаўскаму раёну чатыры [illegible] арцелі павінны даць у [illegible]е 1934 года 34 тысячы тон торфу для гомельскага маргарынавага завода, хімкамбіната і добрушскай фабрыкі. На 25 мая здабыта 772 тоны (4 проц. плана). Сакратар РК КП(б)Б і старшыня РВК аказаліся ў ролі пасіўных наглядальнікаў. Яны ведаюць аб тым, што план торфаздабычы зрываецца і ніякіх мер не прымаюць.

Старшыня арцелі «Перамога» (Васільеўскага сельсовета) Курылін і тэхнарук Сматрэнка (ён-жа парторг) зрываюць здабычу торфу. У той час, як арцель не забяспечана рабочай сілай, Сматрэнка адпраўляе рабочых назад, кажучы, што ў яго «работы няма». Не работы там няма, а размяшчаць рабочых нельга, бо будаўніцтва барака і сталовай правалена. Грамадскае харчаванне не арганізавана, не гледзячы на значныя запасы прадуктаў. Замест сапраўднай барацьбы за план, Курылін і Сматрэнка займаюцца склокамі. А арцель развальваецца. Кладовая з прадуктамі абкрадзена. Украдзен і конь. Усе гэтыя абгіднасці відомы і сакратару райкома тав. Раманенко. Але рашучых мер РК не прыняў.

У пазасобных раённых работнікаў яшчэ пануе даўно асуджанная «тэорыя» чарговасці кампаній. Райпракурор Уваравіцкага раёна, на просьбу аб прыцягненні да адказнасці парушальнікаў дагавора аб наборы рабочай сілы, паведаміў, што ён ніякіх мер зараз не можа прыняць да скончэння пасеўнай кампаніі: «Скончым сяўбу, тады возьмемся за торф». ПЕСКІН.

Заводы Белторфа, на 28 мая не дадалі краіне 14.480 тон машына-фармовачнага торфу

	Дзённая праграма ў тонах	Проц. выканання: Дзённай праграмы	Календарнага плана	Сезоннага плана
Асінторф	1390	70,6	68,0	20,2
«Чырвоны сцяг»	273	62,6	83,8	26,8
Смалявічы	352	118,1	101,9	31,2
Баўмана	47	80,9	127,0	50,7
«Свабода»	280	72,3	83,1	25,4
Лукскі	213	130,3	87,4	20,6
Дукоры	107	77,5	98,6	18,5

Усяго здабыта 56.906 тон машына-фармованнага торфу або 79,7 проц. каляндарнага задання (23,4 проц. сезоннага плана). НЕДАДАНА КРАІНЕ 14.480 ТОН МАШЫНА-ФАРМОВАЧНАГА ТОРФУ.

Выпрацавана на 28 мая фрэзернага торфу 12,3 проц. сезоннай праграмы, разнога торфу — 45,6 проц., малога гідраторфу (па заводу «Чырвоны сцяг») — 8,4 проц.

Асабліва адстаюць па машына-фармовачнаму торфу заводы АСІНТОРФ, «ЧЫРВОНЫ СЦЯГ», ДУКОРЫ.

СІСТЭМАТЫЧНА ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ ДЗЕННУЮ ПРАГРАМУ ТОРФАЗАВОДЫ СМАЛЯВІЧЫ (120-125 проц.). Значна падцягнуўся за апошнія дні торфазавод ЛУКСКІ. За 27 мая здабыта 114 проц. дзённага задання, за 28 мая — 130 проц.

ЛЮДЗІ—АДНЫ, ПАКАЗАЛЬНІКІ—ДРУГІЯ

Лукскі торфазавод уступіў у эксплаатацыю ў красавіку 1934 года. Гадавое заданне завода — 22 тыс. тон торфу. У першыя-ж дні была пушчана пакуль што адна машына. Потым 21 красавіка пачалі працаваць яшчэ дзве. Спачатку брыгады на машынах не выконвалі свае дзённае заданне. Малакваліфікаваныя тарфянікі не ведалі машыны, не ўмелі поўнасцю ле загрузіць.

Мы ўзяліся за арганізацыю тэхнічнага інструктажу, пры дапамозе інжынерна-тэхнічных работнікаў. Разам з гэтым разгарнулі масавую культурна-выхаваўчую работу сярод тарфянікаў. Да кожнага барака прымацаван комуніст або комсамолец, які праводзіць там палітычныя заняткі, масавыя чыткі газет.

Усё гэта стварыла заметны пералом у рабоце пазасобных брыгад. Вось брыгада Звыртоўскага зараз выконвае свае дзённае заданне на 110-130 проц. Брыгада атрымала пераходны сцяг завода. Яе ўдзельнікі атрымалі прэмії (касцюм, боты і інш.). Брыгады тав. Мядзведзева, Навіцкага асабліва сталі даваць высокія паказальнікі торфаздабычы за апошні час. Брыгада Навіцкага замест нормы 31 тыс. цаглін пачас выпрацоўвае па 46 тыс. цаглін.

У сталоўцы торфазавода для ўдарнікаў арганізован асобны стол, дзе лепшыя брыгады і пазасобныя тарфянікі атрымліваюць ударны абед.

На заводзе былі выпадкі спробы з боку чужых элементаў сарваць выкананне торфаплана. У брыгадзе Гусева, Зенькова пралезлі социяльна чужыя элементы (раскулачаныя і высланыя з свайго раёна) як, напрыклад, Янаў, Спольскі Ціхан. Яны імкнуліся ўздзейнічаць на адсталую частку тарфянікаў, тармазілі выкананне плана: і гэтыя брыгады не выконвалі сістэматычна свайго дзённага задання. Пасля таго, як выкрылі гэтых класавых ворагаў, выкінулі іх з брыгады, правялі масавую работу сярод астатніх тарфянікаў, брыгады, як правіла, сталі выконваць і перавыконваць свае вытворчыя заданні.

П. КУДЗІН.

З ПОШТЫ „ЗВЯЗДЫ"

МЕХАНІКІ БЯЗДЗЕЙНІЧАЮЦЬ, МАШЫНЫ НЕ РАМАНТУЮЦЦА

(Пісьмо рабочых)

Полацкая МТМ не ўлічыла ўрокаў па рамонту трактароў у часе падрыхтоўкі да весняной сяўбы. Рамонт уборачных машын зараз знаходзіцца пад пагрозай зрыву. У МТМ ёсць 17 малатарань. Але ніхто з механікаў не ведае, якія патрэбны часткі да іх, якія часткі падлягаюць рамонту. Дэфектыўных вежанасцей на машыны і часткі вала, заяўкі не падаўжены.

Такое-ж становішча з ільнакацорабілкамі. Жнэйкам ёсць 6, але яны не сабраны. Усё гэта робіцца на вачах старшых механікаў МТС Шпакевіча і МТМ Кавалёва. Механік МТМ па сельска-гаспадарчаму інвентару Пірожнікаў і механік бракеровічык Габулёў таксама бяздзейнічаюць. У МТМ няправільна пастаўлена нармаванне працы апарата. Гэта дрэнна адбіваецца на ходзе рамонту.

СІНЯКОЎ
ФРЫДМАН
БРОМАЎ
ШЧАМЯНЕНСКІ.

ЗРЫВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА УБОРАЧНАЙ

(Пісьмо трактарыстаў)

1 кастрычніка 1933 года калгас «Чырвоны арэты», Бераноўскага сельсовета (Мазырскі раён), паслаў за Усебеларускую кантору аўтатрактарнага аб'яднання прысланыя ёй заказныя ведамасці на часткі для трактароў. Дагэтуль частак няма. У часе ўборачнай кампаніі трактар будзе стаяць.

КАМАРОЎ ПЕТР
ЛЕШЧАНКА
РЫЎКІН.

НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ ІГНАРАВАННЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

(Ліст спецыялістаў).

Кіраўніцтва Бярэзінскага раёна не стварае належных умоў для работы сельска-гаспадарчых спецыялістаў. Спецыялісты выкарыстоўваюцца няправільна, ім даручаюць збіраць розныя весткі і т. д. Нарады па гаспадарчых пытаннях праводзяцца без іх удзелу. У пытаннях прымірання старшынь калгасаў у часе пасеўнай кампаніі абыйшліся без думкі спецыялістаў, пра якасць пасеваў пазасобных калгасаў забыліся.

Аграгабінет для павышэння ведаў агранома не арганізован. Матэрыяльна-бытавое абслугоўванне (харчаванне, кватэрныя ўмовы, сродкі перасоўвання па раёну) пастаўлена зусім дрэнна. Спецыялісты Барташэвіч і Макрыца жывуць з дзецьмі ў сырых не адрамантаваных кватэрах і ніхто на гэта не зварочвае ўвагі.

У выніку такіх умоў і адносін з раёну паехала пяць спецыялістаў, а некаторыя з тых, што засталіся, таксама падалі заявы аб звальненні. Пара ўжо кіраўніцтву раёна зацікавіцца гэтым пытаннем.

Група спецыялістаў: райаграном, старшыня ІТР ХЛАПІЦКІ, аграном, старшыня МК МІЛІЕНКА, нач. земпартыі ЧАРНУХІН, аграномы КІСЕЛЬ і САМСОНАВА, зоатэхнік КАЛЕЧЫЦ, тэхнікі-будаўнікі ПЯКАРЧЫК І СМАЛЯКОЎ, камэрнікі БАРТАШЭВІЧ, МАКРЫЦА І АДНАБЛ. ЛДАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: «Звязда» зварочвае ўвагу Бярэзінскага райкома КП(б)Б і чакае паведамлення аб прынятых мерах па пісьму спецыялістаў.

НЯМА МЕДЫКАМЕНТАЎ

Пры соўгасе «Каменка», Крупскага раёна, ёсць медпункт, які таксама абслугоўвае бліжэйшыя калгасы і соўгас «Граніт».

Пункт не мае медыкаментаў. У часе пасеўнай кампаніі пры няпчасных выпадках трэба было ехаць у раённую больніцу, бо на месцы нельга было аказаць дапамогі з-за адсутнасці медыкаментаў. Паводле каштарысу на абсталяванне і закупку медыкаментаў вызначана 600 руб. Гэтыя грошы не скарыстоўваюцца. Райаддзел аховы здароўя менш за ўсё звяртае ўвагі на работу пункта, не гледзячы на неаднаразовыя ўказанні Наркамата аховы здароўя.

БОГДАН.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА МАНДАТ НА УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ КАЛГАСНІЦ-УДАРНІЦ І РАБОТНІЦ СОЎГАСАЎ

Да ўсіх калгасніц і работніц соўгасаў БССР

Дарагія таварышы!

Пасяховым завяршэннем сяўбы мы зрабілі толькі першы крок на шляху да заваявання высокага ўраджаю. Зараз барацьба за высокі ўраджай, за высокую вагу прадукта вырашаецца своечасовай і стопроцантнай праполкай усіх азімых і яравых, усіх тэхнічных культур, у першую чаргу ільну.

Не даць ні адной кроплі вільгаці пустазелля, выраваць усё пустазелле з нашых палёў, знішчыць усіх шкоднікаў палёў—вось на што мы, калгасніцы зоны Хойніцкай МТС, пад кіраўніцтвам свайго палітаддзела мабілізавалі ўсе свае сілы.

Кліматычныя ўмовы гэтага года асабліва спрыяюць росту ўсякага роду пустазелля. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікаў нас арганізаванай барацьбой ачысціць калгасныя палі ад пустазелля, падтаць на гэту справу ўсіх жанчын-калгасніц, усіх калгаснікаў і аднаасобнікаў, усіх работніц соўгасаў, каб высокаякаснай праполкай забяспечыць высокі ўраджай.

Сёння, сабраўшыся разам з аднаасобніцамі на раённы злёт калгасніц-ударніц у ліку 300 чалавек, мы рады паведаміць усіх калгасніц БССР, што заклік ЦК КП(б)Б сустрэў самы гарачы водгук сярод усіх нашых калгасніц. Перадавыя калгасы ўжо сёння рапартуюць аб поўным выкананні першай чаргі праполачных работ.

У калгасах, брыгадах і звенях разгарнулася социялістычнае спаборніцтва на права прымаць удзел ва ўсебеларускім злёце калгасніц-ударніц.

У барацьбу за права на мандат уцягваюцца шырокія масы калгасніц. Уключаючыся ва ўсебеларускае спаборніцтва брыгад і брыгадзіраў на лепшае правядзенне праполачнай і ўборачнай, мы абавязваемся зрабіць здабыткам усіх калгасаў тыя лепшыя ўзоры арганізацыі працы, пры дапамозе якіх дабіліся перамогі нашы перадавыя калгасы.

Добрыя ўзоры расстаноўкі сіл на праполцы, на якіх вучацца ўсе калгасы раёна, паказвае калгас «Селянін». Тут пасеўныя ўчасткі замацаваны за звеннямі да канца ўборкі. Звеньяводы падбіралі склад звеньняў на свайму асабістаму жаданню. Так што ў складзе звеньняў—выключна дружныя жанчыны і дзяўчаты.

Спаборніцтва стала асноўнай формай барацьбы за тэмпы і высокую якасць работ. Спаборнічаюць брыгады, звенні, а галоўнае, асобныя палольчыцы паміж сабой. Індывідуальному спаборніцтву шырока спрыяе індывідуальная здзельшчына. Нормы выпрацоўкі ўстаноўлены ў залежнасці ад засмечанасці поля, ад 0,08, да 0,25 гектара на працадзень.

У калгасе выключна свядомыя адносіны да выхаду на работу. Працуюць ад цямна да цямна, і ў выніку праполка азімых была поўнасцю закончана да 11 мая.

Пагалоўнаму выхаду ўсіх калгасніц на праполку спрыяла арганізацыя яслей на 30 дзяцей і пляцоўкі на 70 дзяцей. Крупы, хлеб, бульбу, цукар для яслей і пляцовак дае праўленне калгаса, малако і іншыя прадукты даюць бацькі.

Ва ўсіх трох брыгадах калгаса выходзяць штодзённа. Выходзяць яны таксама ў звенях.

Па гэтаму-ж узору арганізавана работа ў пераважнай большасці калгасаў раёна. Галоўная ўвага на праполцы адводзіцца якасці. Ні на адну хвіліну не спынілі сваю работу інспекцыі якасці, якія сяброўнае поўвасцю апраўдалі на сяўбе. Не адкладваючы праверку выканання социялістычных дагавораў на пасля, мы ўжо зараз арганізавалі праверку ходу соцспаборніцтва на праполцы. Калгас правярае калгас, брыгада брыгаду, палольчыца палольчыцу.

28 мая ў калгасах зоны Хойніцкай МТС пачалася масавая касьба. Пачалі мы касіць выбарачным парадкам, не чакаючы пакуль можна будзе касіць на ўсіх лугах. Гэта забяспечвае нам поўнае завяршэнне касьбы да пачатку ўборкі ўраджаю. Першы ўкос мы кіркуем на ўсіх калгасах скончыць да 25 чэрвеня, каб не дапусціць ні аднаго дня прастою траў, каб не пагоршыць якасць сена. У часе ўборкі сенажаці мы будзем змагацца за найбольшы ўкос, за нізкую касьбу, за чыстую ўборку і добрае стагаванне.

Адразу пасля скончэння першай праполкі мы правядзем ва ўсіх калгасах рэйд ударніц-калгасніц для праверкі рамонту і становішча ўборачнага інвентара.

Агітфургон палітаддзела Хойніцкай МТС у калгасе імя тав. Молотава.

Мы прапануем усім калгасніцам і работніцам соўгасаў БССР падрыхтоўчыя работы да ўсебеларускага злёта ударніц-калгасніц і работніц соўгасаў правесці пад знакам разгортвання социялістычнага спаборніцтва за лепшае правядзенне праполкі і падрыхтоўкі да ўборачнай.

Прэзідыум злёта калгасніц-ударніц зоны Хойніцкай МТС.

Усебеларускі рэйд праверкі выканання пастаноў ЦК і СНК аб транспарце

Набліжаецца гадавіна гістарычнай ліпеньскай пастановы ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце. Гэтай пастановай партыя і ўрад указалі канкрэтны шлях уздыму транспарта, ліквідацыі яго адставання ад узроўню ўсё ўзрастаючых запатрабаванняў народнай гаспадаркі.

За прайшоўшы час на радзе ўчасткаў чыгуначнага транспарта БССР дасягнуты значныя поспехі (ст. Гарадок, Фарынава і інш.). Несумненнае паляпшэнне работы ёсць у большасці чыгуначных раёнаў БССР. Аднак, гэта паляпшэнне зусім недастатковае і ні ў якім разе не можа нас задаволіць. На некаторых станцыях усё яшчэ не выконваецца адказны план пагрузкі, многа здарэнняў, спазненняў паязздоў, прастояў вагонаў, «очковтирательства» і т. д. (Бабруйск, Жлобін. Замасточча, Езерышча і інш.). Гэта гаворыць аб тым, што не ўсюды яшчэ ўзяліся як след за ажыццяўленне пастаноў партыі і ўрада і не перабудаваліся ў адпаведнасці з іх патрабаваннямі.

Партыя і ўрад асноўную ўвагу сканцэнтравалі на рабоце станцый. Яно і зразумела. Станцыя — галоўнае звяно, якое рашае выкананне плана перавозак. Па прапанове лепшых ударнікаў транспарта паміж станцыямі разгарнулася ўсесаюзнае спаборніцтва. Лепшая станцыя Саюза атрымае сцяг «Праўды».

Гадавіну з дня вынясення ліпеньскай пастановы ЦК і СНК увесь транспарт і ў першую чаргу станцыі павінны сустрэць сур'ёзным паляпшэннем сваёй работы. Для праверкі выканання гэтай пастановы і ходу спаборніцтва станцый рэдакцыямі газ. «Звязда», журнала «Большэвіцкі друк» і газеты «Большевистский путь» пры ўдзеле газеты «Рабочий» праводзіцца ўсебеларускі рэйд на транспарце.

З 1 па 15 чэрвеня рэйд будзе праведзен па буйнейшых вузлавых станцыях МБД чыгункі: Менск, Віцебск, Орша, Барысаў і Полацк. Гэта мерапрыемства мае важнейшае палітычнае значэнне. Поспех яго будзе залежаць ад таго, наколькі мясцовыя партыйныя арганізацыі зразумеюць важнасць гэтага і зробяць рэйд сапраўды масавым, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу ў ім лепшых ударнікаў транспарта і рабкораў.

Праверка будзе закранаць не толькі чыгуначныя арганізацыі, але ў роўнай ступені і тэрытарыяльныя: як яны выконваюць свае абавязацельствы перад чыгункай, як выканана дырэктыва тав. Гінадо аб дапамозе транспарту, хто ніжэйшы у прастоях вагонаў пад грузавымі аперацыямі і т. д.

Па лініі чыгуначнага транспарта праверка будзе ў асноўным сканцэнтравана на рабоце станцый. Тут павінна быць дакладна праверана пастанова аб унутрыстанцыйнага планавання, стан пагрузкі і выгрузкі, перабудова партмасавай работы і профсаюзаў, барацьба за культурны вакзал і культурнае абслугоўванне пасажыраў, стан крытыкі і самакрытыкі і т. д.

Вялікае значэнне для поспеху рэйда будзе мець удзел у ім чыгуначнага і тэрытарыяльнага раённага і нізавога друку. Друк павінен тут паказаць узоры аператыўнасці і зялёнай арганізацыйнай работы. Злёты рабкораў, якія будуць праходзіць пасля скончэння рэйда, падагуляць яго вынікі, з'явяцца сур'ёзнейшым фактарам далейшага росту рабселькораўскага руху і нізавога друку.

Рэйд, які зараз ахапляе пяць вузлавых станцый, з'яўляецца пачаткам усебеларускага рэйда. Недахопы і лепшы вопыт пры правядзенні яго будзе ўлічан пры праверцы ўсіх астатніх станцый БССР.

СПАБОРНІЦТВА ЧЫГУНАЧНЫХ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ ГАЗЕТ І РАБКОРАЎ

БРАНСК, (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Гэтымі днямі адбылася нарада рабкораў Заходняй чыгункі сумесна з рабкорамі прадпрыемстваў і прадстаўнікамі тэрытарыяльных газет. Нарада была склікана дарожнай чыгуначнай газетай «Палітаддзелец» па пытанню сумеснай барацьбы чыгуначных і тэрытарыяльных газет і рабкораў за ўздым работы транспарту, у прыватнасці за замацаванне першынства ў спаборніцтве станцый

Выступленні па дакладу рэдактара газеты «Палітаддзелец» тав. Смалякова пацвердзілі, што да апошняга часу тэрытарыяльны друк вельмі слаба займаецца пытаннямі транспарту. Асноўны недахоп заключаецца ў тым, што тэрытарыяльныя газеты стараюцца капіраваць чыгуначныя і не заняліся галоўным у іх рабоце — барацьбой за паварот тэрытарыяльных арганізацый тварам да транспарта, ліквідацыяй антыдзяржаўных тэндэнцый з боку клікчуры да скарыстання вагонаў, арганізацыяй канкрэтнай дапамогі чыгунцы з боку прадпрыемстваў, устаноў і т. д.

Нарада выказалася за арганізацыю спаборніцтва тэрытарыяльных і транспартных газет і рабкораў на лепшую пастаноўку барацьбы за рэалізацыю пастаноў XVII з'езда партыі, ЦК і СНК. Прынят зварот да ўсіх рабкораў Заходняй чыгункі і прадпрыемстваў.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ГЕРМАНСКАЯ КОМПАРТЫЯ НА ПАСТУ

ЦЮРЫХ. (Інфармацыя «Правды»). Агенцтва «Рунаг» апублікавала справаздачу нелегальнай акруговай берлінскай арганізацыі германскай компартыі. У справаздачы гаворыцца:

«Усе нашы фабрычна-заводскія і абласныя газеты выпусцілі спецыяльныя майскія нумары. Тыраж адных толькі раённых газет дайшоў паводле папярэдніх падлікаў да 28.000 экземпляраў. На буйных прадпрыемствах, як, напрыклад, АЭГ у Геннінгсдорфе, на заводах Сіменса, у Берлінскім транспартным таварыстве, былі вышучаны 1 мая новыя фабрычна-заводскія газеты.

Са зробленага дагэтуль падліку відаць, што 1 мая ў Берліне было распаўсюджана не менш 80.000 комуністычных лістовак. Лістоўкі раскідваліся на вакзалах з вокан гарадскіх паездоў, ва універсальных магазінах, на вуліцах, ля бірж працы, на рынках і т. д.

Некаторыя гарадскія раёны, напрыклад, Штэгліц, былі літаральна навадняны лістоўкамі. Амаль усюды былі расклеены адозвы і плакаты на заводах. У Сіменсштадце былі напісаны на сценах пяць агрэсіўных лозунгаў, тое-ж самае было зроблена на газавым завоце ў Шарлотэнбургу, у лагеры працоўнай павіннасці ў Тэгелі і т. д. На шыльдзе паліцэйскай управы ў Розенталі быў намалёван лозунг: «Няхай жыве Чырвоны баявы май!»

На поўначы Берліна нават працавала невялікая чырвоная таемная радыёстанцыя...

На поўдні Берліна комуністы распаўсюджвалі лістоўкі вакол дома, дзе знаходзіўся вялікі атрад штурмавікоў. Штурмавікі горача спрачаліся паміж сабой з поваду гэтай работы комуністаў, захапляючыся іх бясстрашнасцю».

***

Напружанасць унутранага становішча Германіі падкрэсліваецца венскай газетай «Нейвес вінер журналь». У артыкуле пад загалоўкам «На шляху да 4-й імперыі» газета піша:

«У Германіі пачаўся трывожны рост комуністычнай прапаганды. Комуністычныя лістоўкі навадняюць гарады і вёскі. У рабочых кварталах частымі сталі аблавы паліцыі, шукаючай віноватых. Аднак, аблавы не даюць ніякіх рэзультатаў, бо лістоўкі часткова распаўсюджваюцца штурмавікамі, якія амаль на палову пазналі пад уплыў комуністаў. Штурмавікі друкуюць гэтыя лістоўкі і распаўсюджваюць іх».

ЗАБАСТОВАЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў ТОЛЕДО ПРАДАЎЖАЕЦЦА

НЬЮ-ЮРК, 29 мая (БЕЛТА).

26 мая ўвечары ў Толедо (штат Огайо) бастуючыя рабочыя завода аўтачастак арганізавалі дэманстрацыю, у якой прымала ўдзел 5 тыс. чалавек. Войскі пусцілі ў ход супроць дэманстрантаў слёзатачывыя газы і дубінкі. Прыбываюць новыя войскі. Больш 200 чалавек арыштаваны за апошнія дні вясновымі ўладамі.

***

НЬЮ-ЮРК, 29 мая. (БЕЛТА).

«Уорльд тэлеграм» паведамляе, што ў сувязі са стачачнымі выступленнямі ў Толедо і іншых цэнтрах наглядаецца значнае павелічэнне вырабу слезатачывых газаў. Паміма слезатачывых газаў, прамысловцы заказваюць іншыя віды газаў, якія выклікаюць безупынную рвоту, пасля якой пацярпоўшыя хварэюць суткі.

ЗША ПАТРАБУЮЦЬ АД АНГЛІІ ПОЎНАЙ ВЫПЛАТЫ ДАЎГОЎ

ЛОНДАН, 30 мая. (БЕЛТА).

Як перадае Рэйтэр, ЗША патрабуюць ад Англіі не толькі аплаты поўнасцю ўзносаў 15 чэрвеня па ваенных даўгах, але і прапануюць зрабіць разлікі па двух узносах 1933 г. і поўгадовае пакрыццё сум, адтэрмінаваных па гувераўскаму мараторыю. У вугуле патрабаванне Амерыкі вылічваецца ў суме 239.011.755 даляраў.

ЗАБАРОНА КОМПАРТЫІ Ў ДАНЦЫГУ

БЕРЛІН, 29 мая. (БЕЛТА).

ЯК ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ З ДАНЦЫГА, ПАЛІЦЭЙ-ПРЭЗІДЭНТАМ ДАНЦЫГА ВЫДАНА РАСПАРАДЖЭННЕ АБ ЗАБАРОНЕ І РОСПУСКУ КОМПАРТЫІ І ПРЫМЫКАЮЧЫХ ДА ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЙ — КОМСАМОЛА, САЮЗА ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ, МОПР'а, МІЖРАБПОМА І РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ПРАФАПАЗІЦЫІ.

ЗАЯВА ТЭФІК РУШЦЮ-БЕЯ

ПАРЫЖ, 28 мая. (БЕЛТА).

У гутарцы з супрацоўнікам агенцтва Гавас аб магчымым уступленні СССР у Лігу нацый Тэфік Рушцю-бей заявіў: «Турцыя ад усяго сэрца жадае ўступлення Совецкага Саюза ў Лігу нацый і лічыць, што гэта ўступленне ў вялікай ступені спрыяла-б захаванню ўсеагульнага міру і прынесла-б вялікую карысць як СССР, так і ўсёй Еўропе. Мы, звязаныя з СССР нерасрыўнай дружбай, можам толькі глыбока радавацца гэтай магчымасці».

СОВЕЦКА-КІТАЙСКІЯ АДНОСІНЫ

БЕЙПІН, 29 мая. (БЕЛТА).

У сувязі з прыбыццём т. БАГАМОЛАВА ў Цяньцзін, уплывовая кітайская «Цяньцзін дагунбао» указвае, што яна пастаянна заклікала к совецка-кітайскаму збліжэнню, якое стала асабліва неабходным з часу японскага захвату Манчжурыі.

Газета заўважае, што яна не падзяляе думкі, нібыта совецка-кітайскае збліжэнне павінна быць скарыстана, як сродак супроць Японіі. На думку газеты, неабходнасць совецка-кітайскага збліжэння дыктуецца наступнымі меркаваннямі:

1) правал кітайскай дыпламатыі ў адносінах Японіі робіць неабходным больш цесныя адносіны паміж СССР і Кітаем; 2) мір на Далёкім Усходзе залежыць ад добрасуседскіх адносін паміж Японіяй, Кітаем і СССР; 3) Кітай павінен знаходзіцца ў добрых адносінах з СССР з тым, каб унікнуць пагрозы за безапаснасць паўночна-заходняй граніцы.

З пункту гледжання Кітая існуе адна акалічнасць, якая прадвызначае цесныя адносіны паміж двума краінамі, а іменна, што СССР не мае ніякіх тэрытарыяльных дамаганняў у Кітаі, не ўзбуджае сепаратысцкага руху і не парушае незалежнасці Кітая.

Газета выказвае вялікае расчараванне тым, што да гэтага часу нічога не зроблена для ўмацавання сувязей паміж Кітаем і СССР.

Шэсць месяцаў прайшло, як СССР зрабіў прапанову аб заключэнні пакта ненападу, але з таго часу аб гэтым нічога не чуваць. Нічога не прадпрынята для ўрэгулявання гандлёвых сувязей паміж Сінцзянем і Совецкім Туркестанам.

Газета адкідае сцвярджэнні, што совецка-кітайскія перагаворы аказаліся на мёртвым пункце ў сувязі з пытаннем аб кітайска-ўсходняй чыгунцы.

Калі Японія, не гледзячы на захват Манчжурыі і Жэхэ, можа весці перагаворы з СССР, то няма падстаў, каб Кітай не мог пачаць перагаворы з СССР, не гледзячы на тое, што ён адмовіўся даць адказальнаючы адказ у сувязі з КУЧ.

Газета рэкамендуе нанкінскаму ўраду аддаць асаблівую ўвагу адносінам з моцнымі суседзямі, унікаць саюзаў з якой-небудзь адной краінай, неадкладна ўступіць у перагаворы з СССР аб заключэнні гандлёвага дагавора і вырашэнні многіх совецка-кітайскіх праблем і звярнуць увагу на адносіны ўлад паўночна-заходніх раёнаў Кітая з СССР.

Асаблівай увагі патрабуе палітыка ўлад у Сінцзяне. Прымаючы пад увагу, што СССР не імкнецца к тэрытарыяльнай агрэсіі ў Сінцзяне і улічваючы, што СССР супроць сепаратысцкага руху ў паўднёвым Сінцзяне, — Кітаю не трудна будзе забяспечыць безапаснасць сваёй сінцзянскай граніцы шляхам узгаднення сваіх інтарэсаў з палітыкай СССР.

ВЫСТАЎКА СОВЕЦКАГА ФОТА Ў ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 30 мая. (БЕЛТА).

Выстаўку совецкай фатаграфіі ўжо ў першы дзень наведала 500 чалавек, што тут з'яўляецца рэкордам. Арганізаваўшы выстаўку, саюз польскіх фатографаў атрымаў прапанову аб пераводзе выстаўкі пасля яе закрыцця ў другія буйныя гарады Польшчы.

«Экспрэс паранны» ў поўным захапленні водзыве аб выстаўцы ўказвае, што совецкія фатографы «вучаць нас глядзець на свет па-новаму». Газета снабжае рэцэнзію здымкамі лепшых экспанатаў — «Трактар і ключа» — Дэбавова і «Фізкультурнікі» Шагіна.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Два тыдні назад у Глазго, у памяшканне бюро па вярбоўцы ў армію, была кінута бомба. Яна прычыніла толькі нязначныя пашкоджанні.

На-днях у ваенныя казармы таксама была кінута бомба, не прычыніўшая значных пашкоджанняў. Паліцыя адмовілася даць інфармацыю па гэтаму поваду, указаўшы толькі, што ў абодвух выпадках бомбы былі аднатыпныя.

У якасці кампенсацыі за вызваленне рада с.-д. кіраўнікоў і дапушчэнне іх к рабоце ва уніфікаваных (фашысцкіх) профсаюзах с.-д. кіраўнікі аўстрыйскіх профсаюзаў перавялі назад у Аўстрыю (ў адрас фашызаваных Дольфусам профсаюзаў) грошы ў суме 5 млн. аўстрыйскіх шылінгаў, якія знаходзіліся за граніцай у Бернскім банку і належаць аўстрыйскім профсаюзам.

У венгерскім парламенце прэм'ер Гембеш прапанаваў с.-д. фракцыі далучыцца да «адзінага нацыянальнага фронта». Як паведамляе «Нэйе фрэйе прэса», венгерская с.-д. партыя, следуючы гэтаму закліку, выпрацавала новую праграму дзеянняў, у якой, паводле слоў газеты, значна набліжаецца да поглядаў буржуазіі на прыватную ўласнасць.

НОВЫЯ ПАРУШЭННІ СОВЕЦКАЙ ГРАНІЦЫ ПАРАХОДАМІ МАНЧЖОУ-ГО

ХАБАРОЎСК, 29 мая. (БЕЛТА).

Як стала відома, 27 і 28 мая мелі месца новыя парушэнні совецкай граніцы па рацэ Амур параходамі, ішоўшымі пад сцягам Манчжоу-Го.

27 мая поградзам пагранічнай аховы ў раёне к захаду ад Брэставаградзівіхінскай быў выяўлен рух буксірнага парахода з баржай уверх па Амуры на адлегласці 6 метраў ад совецкага берага. Пасля двух папярэдніх стрэлаў, зробленых поградзам пагранічнай аховы, пароход адышоў ад берага і пашоў уверх па рацэ, узяўшы курс на горад Сахалян.

28 мая пароход з баржай пры цацыходзе да вусця ракі Зеі, ля горада Благавешчанска, ухіліўся ад фарватэра ракі Амур у бок совецкага берага на 200 метраў, потым, увайшоўшы ў вусце Зеі, якая з'яўляецца ўнутраной совецкай ракой, прайшоў уверх па цячэнню адзін кілометр, следуючы ўвесь час на адлегласці 30-35 метраў ад берага.

Невядомай асобай пры дапамозе ўстаноўленага на штацыве на капітанскім мосціку фотаапарата праводзілася безупыннае фатаграфаванне совецкіх берагоў, для аблягчэння чаго пароход следаваў увесь час надзвычай павольным ходам.

Вартавым пагранічнай аховы, выявіўшым гэта парушэнне граніцы, былі прыняты меры да затрымання парахода, для чаго ён зрабіў два папераджальныя стрэлы ўверх. Не зважаючы ўвагі на сігналы вартавога парахода прадаўжаў свой курс уздоўж совецкага берага, пасля чаго вартавым быў зроблен стрэл па пароходу. Адразу-ж пасля гэтага пароход рэзка змяніў курс і ўвайшоў у фарватэр Амура далей к прыстані г. Сахаляна, дзе спыніўся.

Па ўсім гэтым назначана закладнае следства.

КАШТОЎНАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА

Па прапанове тав. МАРОЗА, механіка СЛУЦКАЙ МТС, перарэканструявана лугавая барана «ГАНКМО» ў параконны палольнік-культыватар вышынёй у 30 см. для міжрадковай апрацоўкі лугавых траў, гародніх культур і махоркі.

Пераробка заключаецца ў наступным: тры зуб'і выкінуты для атрымання адлегласці ў 25 см. паміж радкамі, астатнія зуб'і размяшчаюцца так, што за адзін след апрацоўваецца адзін рад цалкам і два рады з аднаго боку, гэта значыць два рады поўнасцю.

Перастаноўку зуб'яў можна рабіць на патрэбную шырыню. Зуб'і пераробленны па тыпу культыватарных толькі з меншым загібам і меншай плошчай рабочай часткі зуб'яў.

У адрозненні ад культыватарных зуб'яў, якія пры рабоце засыпаюць рады, пераварочваючы зямлю, гэта канструкцыя толькі рыхліць зямлю, не засыпае радоў, выдзёргвае пустазелле. Пласцінкі ад задніх колаў зусім выкідаюць пустазелле наверх. Зямля перапрацоўваецца дастаткова, бо паміж радамі ў 40 см. праходзіць 6 зуб'яў. Салазка ўперадзе бараны заменена спецыяльным перадком на двух калёсах. Чалавек, які працуе на палольніку, сядзіць на спецыяльным сядзенні і мае магчымасць паміма кіравання конымі, рэгуляваць патрэбную глыбіню апрацоўкі да 10—12 см. Прадукцыйнасць —да 4 гектараў за дзень у адзін след, што замяняе да 150 чалавекадзён.

Такім чынам перароблены ўсе 9 барон, якія ёсць у Слуцкай МТС, і яны на рабоце поўнасцю сябе апраўдалі.

Тав. МАРОЗ за вынаходніцтва атрымаў прэмію ў 300 руб.

Нач. палітаддзела БАНГАЙЦІС.

ПЕРАМОГА ГОМСЕЛЬМАША

ГОМЕЛЬ. Гомсельмаш майскае ўрадавае заданне па малатарнях выканаў датэрмінова. 30 мая адгружана 301 малатарня і 311 конных прывадаў. (План — 300). Гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы шырока разгорнутай масавай рабоце на заводзе і актыўнай дапамозе гаркома партыі і прадпрыемстваў Гомеля.

КАЛАМЕЕЦ.

ГАРАДОК АДПАЧЫНКУ ЎДАРНІКА

БАБРУЙСК, 29 мая. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Партыйны і заводскі камітэты дрэваапрацоўчага камбіната арганізуюць у лясной мясцовасці адналзенны дом адпачынку для ўдарнікаў. За летні перыяд праз дом адпачынку будуць прапушчаны каля 500 рабочых.

Бабруйскі раённы камітэт партыі і райпрофсавет абмяркоўваюць пытанне аб арганізацыі спецыяльнага гарадка адпачынку ўдарніка.

ДОМ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ КАЛГАСНІКАЎ

На апошнім пасяджэнні совета Слуцкай МТС па прапанове начальніка палітаддзела тав. БАНГАЙЦІСА было ўхвалена пачаць будаўніцтва дома адпачынку для калгаснікаў.

Дом адпачынку разлічан на 100 чалавек.

Калгасы абавязаліся даць для будаўніцтва рабочую сілу і будаўнічыя матэрыялы і апрача таго 25 тысяч руб. грашмі.

Дом адпачынку будзе закончан да пачатку ўборкі ўраджаю. Лепшыя ўдарнікі ўборкі калгаснага ўраджаю атрымаюць першае месца ў доме адпачынку.

АДКРЫЎСЯ МАСКОЎСКІ МЕДЫЦЫНСКІ „ТЫДЗЕНЬ"

Учора ў Менску пачаўся маскоўскі медыцынскі тыдзень.

Першае пасяджэнне адкрыў народны камісар аховы здароўя БССР тав. СУРТА.

Нарком адзначыў велізарнае значэнне «тыдня» для азнаямлення медыцынскіх работнікаў Беларусі з навейшымі дасягненнямі совецкай медыцыны, для абмену практычным вопытам і яшчэ большага ўзмацнення сувязі паміж навукова-даследчымі інстытутамі БССР і РСФСР.

Тав. СУРТА падкрэсліў, што маскоўская медыцынская грамадскасць аказала вялікую дапамогу і падтрыманне ў арганізацыі «тыдня», выпучыўшы найбольш выдатных вучоных для паездкі ў Менск.

У прэзідыум «тыдня» абраны т.т. СУРТА, наркомасветы БССР тав. ЧЭРНУШЭВІЧ, прэзідэнт Беларускай акадэміі навук тав. ГОРЫН, акадэмікі ГАЎСМАН, ВАЛЬФСОН, намеснік наркома аховы здароўя тав. ОЛІКЕР, праф. МЕЛКІХ, ХАЗАНАЎ, МАРКАЎ, КОРЧЫЦ і інш.

Бурнымі апладысментамі была спаткана прапанова аб абранні ў прэзідыум удзельнікаў «тыдня» маскоўскіх вучоных.

Былі заслуханы надзвычай цікавыя даклады праф. ЛУРЫЯ «Аб гастрапатыях» і праф. ЛЕВІТА «Аб аператыўным лячэнні хвароб страўніка».

«Тыдзень» выклікае вялікі інтарэс сярод медыцынскіх работнікаў. Аўдыторыя нервовай клінікі перапоўнена. З раёнаў выклікана 25 медыцынскіх работнікаў. Прысутнічае таксама 55 участковых дактароў.

Сёння ў 5 гадзін у клубе металістаў адбудзецца другое пасяджэнне. Будуць заслуханы даклады праф. ЛЕВІТА «Аб раку страўніка» і праф. ЛУРЫЯ «Аб малюнку хваробы».

СПРАВА ВЯЛІКАГА ЗНАЧЭННЯ

У гутарцы з супрацоўнікам Белта праф. Р. А. ЛУРЫЯ паведаміў наступнае аб задачах маскоўскага медыцынскага тыдня ў Менску:

Арганізацыя маскоўскага медыцынскага тыдня ў сталіцы БССР Менску мае асаблівае значэнне для навуковых медыцынскіх і для шырокіх мас дактароў-практыкаў. Гэты тыдзень павінен паказаць агульнасць навуковых інтарэсаў на-

шых брацкіх саюзных рэспублік у справе ажыццяўлення задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад медыцынай у другой пяцігодцы.

Бурны рост совецкай медыцынскай навукі за апошнія гады знайшоў сваё адлюстраванне ў шматлікіх усесаюзных з'ездах па паўных спецыяльнасцях, але на гэтыя з'езды збіраліся толькі паасобныя делегаты, якія працуюць у данай галіне медыцыны. Азнаёміць дактароў і працоўныя масы брацкай рэспублікі з галоўнейшымі заваяваннямі тэорыі і практыкі медыцыны — вось асноўная задача маскоўскага тыдня ў Менску.

Пытанні павышэння кваліфікацыі дактароў, стварэння кадраў дактароў-спецыялістаў, безумоўна, з'яўляецца істотнай прадпасылкай для павышэння якасці медыцынскай дапамогі ў краіне. Гэта з'яўляецца другой задачай тыдня. Таму цэнтральны маскоўскі інстытут удасканалення дактароў узяў на сябе арганізацыю дакладаў маскоўскіх прафесароў у Менску.

Я павінен азнаёміць таварышоў з актуальнымі пытаннямі вучэння аб захворваннях страўніка. У гэтай галіне ёсць шмат новага. Я азнаёмлю таварышоў з сучаснымі дасягненнямі ў галіне вывучэння гэтых хвароб, падыходу да разумення хворага чалавека, яго суб'ектыўных адчуванняў і скаргаў, якія маюць пры правільным даследванні не меншае значэнне, чым так званыя аб'ектыўныя даследванні — лабараторныя, рэнтгенаўскія і т. д.

Маё першае ўражанне ў Менску — гэта бурны рост культуры ў горадзе, які пры царызме з'яўляўся цэнтрам спекуляцыі і ачагом галечы.

Клінічны гарадок з вельмі добра абсталяванымі медыцынскімі ўстановамі, якія даюць вялікі прастор для навуковай работы, масы студэнтаў у клініках, новыя будынкі медыцынскага інстытута за універсітэцкім гарадку, грандыёзнае будаўніцтва політэхнічнага інстытута, Беларускай акадэміі навук, тэатры на мовах розных нацыянальнасцей — усё гэта выразна адлюстроўвае велізарны рост культуры ў Совецкай Беларусі і з'яўляецца лепшым доказам перамог ленінскай палітыкі комуністычнай партыі і яе геніяльнага правадыра таварыша СТАЛІНА.

КАЛГАСНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ ПАЛІТАДДЗЕЛА ПРЫ ГОРАЦКАЙ МТС АДКРЫТ ПЕРШЫ Ў БЕЛАРУСІ КАЛГАСНЫ УНІВЕРСІТЭТ. ЗАНЯТКІ БУДУЦЬ ПРАХОДЗІЦЬ АДЗІН РАЗ У ДЭКАДУ. ДЛЯ ВЫКЛАДАННЯ ПРЫЦЯГНУТЫ ЛЕПШЫЯ ПРАФЕСАРСКІЯ СІЛЫ ПА АГРАТЭХНІЦЫ І ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ З ГОРАЦКАГА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА.

УНІВЕРСІТЭТ УКАМПЛЕКТОВАН НА 70 ПРОЦ. КАЛГАСНІЦАМІ-ЎДАРНІЦАМІ. ДЛЯ АБСЛУГОЎВАННЯ СЛУХАЧОЎ З НАЙБОЛЬШ АДДАЛЕНЫХ КАЛГАСАЎ БУДУЦЬ АРГАНІЗАВАНЫ ВЫЯЗНЫЯ ЛЕКЦЫІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» склікае 31 мая ў 12 гадзін дня нараду па пытанню:

ЗАДАЧЫ ДРУКУ Ў РАЗГОРТВАННІ ТАВАРАЗВАРОТУ.

На нараду запрашаюцца ад Наркамлегпрома — т. АЯЗІНСОН, ад Наркамснаба т. КЛАДАВІКОЎ, Наркамфіна — тт. ЕЛЯНЕЎСКІ і ЗАГАЧЫН, ад Дзяржбанка т. ГАЛЯТОЎСКІ, ад Белкалгаса т. МАТУСЕВІЧ, ад камісіі Совецкага Кантроля т. АДЛЕРШТЭЙН, ад ЦОПСА т. ГЕРАЎКЕР, ад дзяржаўнай інспекцыі цен т. ТАЛАЧАЎ, Белгандля т. МОУШЫНЗОН, Белхарчгандля т. СЯМЕНАЎ, дырэктар дзяржаўнага універмага т. ГУРЗВІЧ, камітэта таварных фондаў т. ГЕАРГАДЗЕ, прадстаўнік канвенцыйнага бюро Наркамснаба, загатычкі бакамі Белкаапсаюза, Саюзшвейсбыта, Шклосбыта, «Хлопкасбыта», Саюзскурсбыта, ад МГРК т. ПЛОТКІН, ад Усякабанка т. БАЙРАШЭЎСКІ, старшыні праўлення ЗРК імя Варашылава, «Кожтаргка» «Октябр» і абутковай фікі, загатычкі аддзелаў тавараазвароту газет «Рабочий», «Калгаснік Беларусі», «Октябр», «Оркі», «Чырвоная змена» корпункт «Правды», рэдактары шматтыражак і насценгазет Белкаапсаюза, Наркамснаба, Белгандля, Наркамлегпрома, Наркамфіна, МГРК.

З дакладам аб задачах друку ў галіне разгортвання тавараазвароту выступіць намеснік загатычкі совецка-гандлёвага аддзела ЦК КП(б)Б тав. ТАВАКАЛЬЯН.

Нарада адбудзецца ў памяшканні рэдакцыі «Звязды» (Совецкая, 63, 3-ці паверх, сакратарыят).

Нам. адк. рэд. А. П. ДЖЭЛЮК.

Інстытут удасканалення ўрачоў і адзінае медыцынскае таварыства

Сёння, 31 мая — у клубе металістаў у 5 гадзін вечара адбудзецца

ДРУГОЕ ПАСЯДЖЭННЕ

МАСКОЎСКАГА МЕДЫЦЫНСКАГА ТЫДНЯ

Даклады: праф. ЛУРЫЯ Р. А. „Аб унутранай карціне хваробы".
Праф. ЛЕВІТ С. А. „Аб раку страўніка".
1 чэрвеня ў 101 аўдыторыі анатамічнага корпуса медыцынскага інстытута ў 6 гадзін вечара даклады праф. ЗІЛЬБЕРА Л. А. „Сучасныя праблемы фільтруючыхся сервіратаў.
„Новае у вучэнні аб інфекцыі і імунітэце".
2 чэрвеня ў клубе металістаў у 6 гадзін вечара даклады заслужанага дзеяча навукі праф. КІСЕЛЯ. „Новае ў вучэнні туберкулёзе"; „Новае ў пе дыятрыі".
3 чэрвеня ў клубе металістаў у 6 гадзін вечара даклады заслужанага дзеяча навукі праф. ПЛЕТНЕВА. „Праблема лісцявога неўроза" і „Сінтэтычны светапогляд у клініцы".
4 чэрвеня ў клубе металістаў у 6 гадзін вечара даклады праф. ШЭРАШЭЎСКАГА. „Праблема мазгавога прыдатка ў сучаснай эндакрынналогіі", „Роля актыўных метадаў лячэння ў сучаснай тэрапіі".
5 чэрвеня ў клубе металістаў у 6 гадзін вечара даклады праф. ЗЕЛЕНІНА В. С. „Псіхіка і сэрца", „Станакардыя".

ДЫРЭКЦЫЯ.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад 31-га мая новы гукавы мастацкі фільм

„ВЯЛІКІ ТОКІО"

(ЗДЫМКІ ЗРОБЛЕНЫ У ЯПОНІІ)

Рэжысёр—Н. ШНЕЙДЗРАЎ. Кампазітар—КОСАК-ЯМАДА.
У ПРАГРАМЕ — новы гукавы Саюзкінакурнал № 13.
У ФАЙЕ—перад кожным сеансам немэтрыкаа аддзяленне па вусім новай праграме.
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ: 6, 7-30, 9, 10-30. КАСА—ад 1 гадз. дня.

Н. ГАСТРОЛЯМІ Н. ГАСТРОЛЯМІ

ЛЕНІНГРАДСКІ ЖАНОЧЫ ДЖАЗ „МІС"

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ОЛЬГІ БАРАШ.

Менскі дашкольны тэхнікум АБВЯШЧАЕ асенні НАБОР на 1 курс.

Прымаюцца скончыўшыя сямігодку, або маючыя веды за сямігодку.

Прыём заяў да 19.VIII. Да заявы дадаць наступныя дакументы (у арыгіналах): аб адукацыі, метрыку, даведку аб сост новішчы і соцпаходжанні, аб здароўі, заверанную анкету, 2 фотакарткі і пашт. марку на 40 кап.

З 20.VIII па 27-VIII іспыты па роднай мове і літаратуры, матэматыцы, грамадазнаўству, геаграфіі.

Залічэнныя забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпендыяй.

Заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Совецкая, 144, дашкольны тэхнікум.

Дырэкцыя.

Кіно Інтэрнацыянал Сёння новая праграма

Кіно „СПАРТАК".

Ад 31 мая

2-я і 3-я (апошняя) серыі

2 СЕРЫІ У АДЗІН СЕАНС 2

МІС-МЕНД

У праграме кіно-хроніка.
ШТОДЗЕННА 6 СЕАНСАЎ.
КАСА—з 4 гадзін дня.

МЯНЯЮ пакой у цэнтры, з удобствамі (парав. ацыл., водапровад, ванна), 14 кв. м. на адзін вялікі або два невялікія, незалежна ад раёна, але па лініі трамвая. Карла Маркса 33, кв. 49 (5-ы пад'езд) ДОНІН. Бачыць з 7 да 9 гадзін вечара.

1 чэрвеня ў 6 гадзін вечара ў Доме партактыва імя Карла Маркса (вялікая заля) адбудзецца

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў:

ПАРАДАК ДНЯ:
1. а) аб ходзе жыллёвага будаўніцтва (ПІМЕЛЬШТЭЙН),
б) аб ходзе будаўніцтва па водапроводу і каналізацыі (СТАНКЕВІЧ, АДЗІНЦОЎ).
2. Аб рабоце і развіцці мясцовай прамысловасці (ВАРАНКОЎ).
3. Аб конкурсе совецкіх (ШУЛЬКІН).
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў горсовета абавязкова.
Запрашаюцца совецкі і прафесіянальны актыў і ударнікі прадпрыемстваў і ўстаноў.
Білеты можна атрымаць у горсовеце ў 37-м пакоі (3-ці паверх).

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

СЁННЯ, 31 мая ў 7 гадзін вечара, у памяшканні горсовета (вул. Карла Маркса, 14, пакой 32, 2-гі паверх) СКЛІКАЕЦЦА

ПАШЫРАНАЯ НАРАДА УСІХ КАМСОДАЎ

ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І УСТАНОЎ, СУМЕСНА З ФІНАКТЫВАМ.
Старшыням камсодаў забяспечыць своечасовую яўку.

ГАРФА, ГАРКАМСОД.

ПАСТАНОВА

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

16 мая 1934 г. *гор. Менск.*

АБ КАМАНДЫРОЎКАХ У МАСКВУ

Менскі гарадскі совет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць, што дазвол на паездку ў камандыроўку ў Маскву кіраўнікам раённых і гарадскіх арганізацый, а таксама работнікам аддзелаў горсовета дае старшыня горсовета, а ў яго адсутнасці—яго намеснік.

2. Абавязаць усіх работнікаў, камандыруемых у Маскву рэгістравацца ў сталым прадстаўніцтве ВССР пры ўрадзе Саюза.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.

Сакратар Менгорсовета КАПЯЛЕВІЧ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ

На 5-га чэрвеня 1934 г. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б сумесна з політсектарам Наркамзема і рэдакцыямі газеты «Звязда» і журнала „Большэвіцкі друк" склікаецца нарада рэдактароў раённых і палітаддзельскіх газет ільнаводчых раёнаў.

ПАРАДАК ДНЯ НАРАДЫ:

1. Масавая і арганізацыйная работа газет па пытаннях: а) праполкі і падрыхтоўкі да ўборкі і апрацоўкі ільну, б) сенакашэння, в) ворыва, папару і палінны.

2. Аб ходзе рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б па пытанню работы з рабселькорамі і карэспандэнтамі, паступаючымі ў рэдакцыі.

На нараду выклікаюцца рэдактары раённых і палітаддзельскіх газет наступных раёнаў: Асвейскага, Бялынічскага, Бешанковіцкага, Ушацкага, Гарадоцкага, Горацкага, Дубровенскага, Дрысенскага, Крупскага, Лёзненскага, Лепельскага, Мсціслаўскага, Полацкага, Расонскага, Сіроткінскага, Сенненскага, Суражскага, Талачынскага, Чавускага, Чашніцкага, Шклоўскага і па аднаму рэдактару насценгазет ільнаводчых калгасаў Сенненскага, Шклоўскага, Мсціслаўскага, Лёзненскага і Полацкага раёнаў.

Адкрыццё нарады ў малай зале Дома партактыва роўна ў 11 гадзін раніцы.

Нам. заг. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б ПАСЮКЕВІЧ.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Гапўлітбіка № К—3072.